І СПЯВАЮЦЬ,
І ГАТУЮЦЬ,
І ГАДУЮЦЬ

Сямейная

ШТО
ТРЭБА ВЕДАЦЬ
ПРА ВЯНЧАННЕ Сямейная

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 КАСТРЫЧНІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 206 (28822)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй РАЎКОЎ, міністр абароны:

«Цеснае супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і Расіяй паспяхова ажыццяўляецца ў палітычнай, эканамічнай, ваеннай, навуковай, культурнай і іншых галінах. Аднак інтэграцыя ў справе забеспячэння бяспекі Саюзнай дзяржавы ў гэтым шэрагу займае асаблівае месца. Супрацоўніцтва з Расіяй у ваеннай сферы з'яўляецца як адчувальным фактарам стабільнасці для нашых краін, так і важным элементам стратэгічнага стрымлівання пагроз АДКБ ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне».

КАРАТКА

- Больш за 7 км дарог адрамантуюць у Браславе да «Дажынак-2019».
- **У Кобрынскім раёне супрацоўнікі МНС узарвалі недабудаваны камбікормавы завод.**

- Беларусь і Турцыя працягваюць прапрацоўку праекта па арганізацыі грузавых зносін па Дняпры.
- **Кіроўца маршруткі, якая разбілася 18 кастрычніка пад Валожынам, за два гады 30 разоў прыцягваўся да адказнасці за парушэнне ПДР.**
- Беларусь у пяць разоў нарасціла пастаўкі прадуктаў харчавання ў Кітай за восем месяцаў 2018 года.
- **Кіроўцы грузавікоў пры выездзе ў Літву цяпер змогуць загадзя задэкляраваць паліва і прад'явіць дэкларацыю ў электронным выглядзе.**

ISSN 1990 - 763X

На пачатку шляху

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вучні малодшых класаў Цяцерынскага вучэбна-педагагічнага комплексу «дзіцячы сад — сярэдняя школа» Круглянскага раёна раз'язджаюцца па сваіх вёсках пасля заняткаў на жоўтым школьным аўтобусе.

Гарадское асяроддзе

ХУТКА І БЕЗ ЗАТОРАЎ

Эксперымент па разметцы праезнай часткі для веласіпедаў праходзіць у Брэсце

На вуліцы 17 Верасня ў абласным цэнтры ўвагу адразу прыцягвае не зусім звычайная разметка праезнай часткі. Уздоўж па дарозе праходзіць зялёная паласа. Гэта дарожка для двухколавага транспарту.

Начальнік міжраённага аддзела арганізацыі дарожнага руху Брэсцкага абласнога ДАІ Уладзімір ФЯСЬКОЎ расказаў, што так праходзіць эксперымент па ўладкаванні велапаласы. Калі новая арганізацыя руху сябе апраўдае, паласа будзе прадоўжана да вуліцы Арджанікідзэ, дзе цяпер узводзіцца аўтавакзал.

СТАР. 4

Фота Аляксандра ШУЛЫГАЧА.

(Не)тыповыя беларусы

«КОЖНАЯ СУСТРЭЧА — АДЗІНАЯ»

Пра нас і наша жыццё скрозь прызму чайнай цырымоніі

«Японская восень — 2018». *Крайні справа* — Святаслаў ГАЕЎСКІ.

Сённяшні герой нашай рубрыкі яшчэ ў дзяцінстве захапіўся культурай Краіны ўзыходзячага сонца. Зараз Святаславу Гаеўскаму амаль 50, у яго жонка-японка і двое дзяцей. Яны жывуць у Мінску, але стыль іх жыцця даволі значна адрозніваецца ад прынятага ў сярэднестатыстычнай беларускай сям'і. Святаслаў расказаў нам пра японцаў і беларусаў, пра ўменне бачыць вялікае ў малым і малое ў вялікім і пра тое, што прынцыпы чайнай цырымоніі — гэта наогул пра жыццё...

СТАР. 13

Бяспека

ШЧЫТ САЮЗА

У Мінску адбылося пасяджэнне сумеснай калегіі міністэрстваў абароны Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

Фота БелТА.

Кіраўнікі ваенных ведамстваў дзвюх краін Андрэй Раўкоў і Сяргей Шайгу абмеркавалі рэалізацыю плана сумесных мерапрыемстваў па забеспячэнні ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы, у тым ліку ўдасканаленне аб'яднаных ваенных сістэм і ход выканання праграм ваеннага складніка Саюзнай дзяржавы.

— Працягваецца развіццё і паглыбленне вытворчай і навукова-тэхнічнай кааперацыі нашых прадпрыемстваў у галіне распрацоўкі і вытворчасці ўзбраення і ваеннай тэхнікі, — сказаў **Андрэй РАЎКОЎ.** — Расія з'яўляецца нашым асноўным партнёрам у пастаўках прадукцыі ваеннага прызначэння, а таксама ў рамонце і мадэрнізацыі ўзбраення і ваеннай тэхнікі.

Паспяхова рэалізуецца супрацоўніцтва ў галіне падрыхтоўкі ваенных кадраў. Зараз у інтарэсах беларускай арміі ў Расіі навучаецца больш за 450 спецыялістаў.

— Існуе нямала і іншых сфер вайсковага супрацоўніцтва, дзе мы дасягнулі значных вынікаў. Гэта дазваляе на працягу многіх гадоў характарызаваць узаемадзеянне нашых абаронных ведамстваў як дынамічнае і эфектыўнае, — падсумаваў Андрэй Раўкоў.

Адной з асноўных тэм пасяджэння стала сумеснае аператыўнае вучэнне Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі «Шчыт Саюза — 2019». Вучэнне пройдзе на тэрыторыі нашай суседкі і стане галоўным мерапрыемствам сумеснай падрыхтоўкі органаў ваеннага кіравання і войскаў у будучым годзе.

Сяргей ШАЙГУ заявіў, што ваенная актыўнасць НАТА дасягнула небывалага ўзроўню з часоў халоднай вайны.

— Палітыка альянсу накіравана на ўзмацненне сваёй перадавой ваеннай прысутнасці на ўсходнім флангу. Для гэтага НАТА актыўна выкарыстоўвае міф аб расійскай пагрозе. Пашыраюцца маштабы аператыўнай і баявой падрыхтоўкі каля нашых межаў, расце іх інтэнсіўнасць. Краіны блока адпрацоўваюць задачы вядзення баявых дзеянняў наступальнага характару. Да гэтых мерапрыемстваў альянс актыўна падключае пазаблокавыя краіны.

Асабліва адзначыў расійскі міністр, што планы польскага ўрада размясціць на пастаяннай аснове на сваёй тэрыторыі дывізію ўзброеных сіл ЗША контрпрадукцыйныя і не спрыяюць захаванню стабільнасці і ўмацаванню нацыянальнай бяспекі.

— У гэтых умовах мы вымушаны прымаць меры ў адказ і павінны быць гатовыя нейтралізаваць магчымыя вайсковыя пагрозы на ўсіх напрамках. Падкрэслю, што мы не хочам уцягвацца ў ваенную канфрантацыю з Захадам і імкнёмся да ўзаемнага супрацоўніцтва па ўсім спектры бяспекі, — дадаў Сяргей Шайгу.

У рамках калегіі кіраўнікамі ваенных ведамстваў падпісаны шэраг важных дакументаў у галіне ваеннага супрацоўніцтва, у тым ліку пагадненне аб абмене інфармацыяй аб перспектыўных тэхналогіях і распрацоўках. Згаданае пагадненне рэгламентуе абмен інфармацыяй паміж міністэрствамі абароны Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па навуковых даследаваннях і распрацоўках, якія выкарыстоўваюцца для стварэння перспектыўных узораў узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі.

Таксама падчас пасяджэння зацверджаны план работы сумеснай калегіі на наступны год, у які ўнесены толькі найбольш важныя і перспектыўныя кірункі двухбаковай ваеннай дзейнасці. У ліку падпісаных дакументаў — план мерапрыемстваў, прымеркаваных да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Сяргей КУЛАКОЎ.

Медыяцыя

Найкарацейшы шлях да справядлівасці

Вырашаць канфлікты мірам карысна і дарослым, і дзецям, асабліва калі з праблемамі непаўналетніх і іх спрэчкамі дапамагае справіцца юны медыятар, а не сур'ёзны дарослы. Праект школьнай медыяцыі «Вучымся разумець адзін аднаго», які тры гады таму пачаўся ў некалькіх сталічных школах, ужо мае практычныя вынікі. Ва ўстановах адукацыі запрацавалі школьныя службы медыяцыі, дзе ўсе ўдзельнікі — вучні, колькасць падлеткавых праблем, накшталт цкавання аднакласнікамі і іншых непрыемных з'яў, значна скарацілася, а ў ВНУ рыхтуецца да выкладання курс па медыяцыі.

Карысць такога пачынання і эфектыўнасць працэдуры медыяцыі ў вырашэнні спрэчак на ўзроўні краіны падкрэсліваюць не толькі ўдзельнікі праекта, а і прадстаўнікі розных ведамстваў, якія паспрабавалі гэты працэс на практыцы.

— Дзякуючы пашырэнню практыкі выкарыстання медыяцыі зараджаюцца працэсы, якія ў будучыні дазволяць паляпшаць грамадскія адносіны і ствараць спрыяльны асяродак для развіцця асобы, — заўважыў **Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, старшыня Саюза юрыстаў Беларусі.** — Замена фармальных карных метадаў рэагавання на канфлікты з удзелам непаўналетніх механізмамі аднаўленчага правасуддзя выклікае цікавасць у розных прафесійных суполках: юрыстаў, псіхолагаў, канфліктолагаў. Гэтая работа асабліва важная тым, што тут задзейнічана асаблівая катэгорыя грамадзян — дзеці і падлеткі, якія не заўжды гатовыя гаварыць пра свае праблемы з настаўнікамі, бацькамі і тым больш міліцыяй.

Ён дадаў, што прыхаваныя крыўды ў дарослым жыцці могуць не толькі сапсаваць характар, але і прывесці да больш сур'ёзных праблем, таму на школьную медыяцыю ўскладаюцца асаблівыя надзеі не толькі ў плане аздараўлення псіхалагічных абставін, але і выхаваўчага механізму і прафілактыкі канфліктаў з законам.

— Дзеці часта стараюцца ўтаіць ад дарослых свае праблемы, мяркуючы, што разбяруцца самі. Праводзячы ў школах такую сур'ёзную работу, Цэнтр медыяцыі і права вучыць дзяцей міратворчай функцыі. І ў дарослым жыцці ўменне вырашаць канфлікты ім спатрэбіцца, — мяркуе **Мікалай СТАРАВОЙТАЎ, намеснік міністра юстыцыі Беларусі.**

Дзеці пасля ўдзелу ў медыяцыі, як правіла, знаходзяць агульную мову і вырашаюць канфлікт.

Ірына СІДАРОК.

Блізкая ўлада

Лепш убачыць, чым пачуць

Старшыня Мінаблвыканкама ацаніў сітуацыю на месцы

Восем зваротаў разгледзеў старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА падчас асабістага прыёму грамадзян у Любані. Датычыліся яны добраўпарадкавання тэрыторыі, капітальнага рамонту, газіфікацыі населеных пунктаў, паляпшэння жыллёвых умоў ды іншага.

Сяргей Рэзнік шаснаццаць гадоў адпрацаваў участковым інспектарам у гарадскім пасёлку Урэчча. Яго сям'я пражывае ў доме, які належыць адкрытаму акцыянернаму таварыству «Урэцкі». Пасля звальнення з міліцыі Сяргей Аляксандравіч некалькі месяцаў шукаў работу. Па яго словах, не супраць быў уладкавацца і ў сельгасарганізацыю, каб за ім засталося жыллё. Але яму адмовілі. Нарэшце мужчына знайшоў месца працы ў лясгасе, і ўласнік папрасіў вызваліць жыллё, а іншага даху над галавой сям'я не мае.

Як сцвярджае дырэктар акцыянернага таварыства Вераніка Марозава, былому ўчастковаму прапаноўвалі работу на ферме, ды ён не пагадзіўся. А па дагаворы на працягу дзесяці дзён пасля звальнення з РАУС ён павінен вызваліць жылое памяшканне.

— Якая ў вас адукацыя? — пацікавіўся Анатоль Ісачанка ў заяўніка.

— Аграрная, я — тэхнік-электрык, — такі быў адказ.

— Вам не патрэбныя людзі з гэтай спецыяльнасцю? — задаў пытанне губернатар кіраўніку гаспадаркі.

— Нядаўна ў нас вызвалілася пасада электраманцёра, — кажа яна.

— Прапануйце яе Сяргею Аляксандравічу. Не захоча працаваць — звольніце з высяленнем з кватэры. Тут усё дакладна ясна і зразумела, — выказаўся старшыня аблвыканкама.

Пры звальненні з ранейшага месца працы па заканадаўстве неабходна адпрацаваць месяц. «Але пачакаем, няхай піша заяву», — пагадзілася Вераніка Марозава.

Анатоль Ісачанка даручыў адпаведным службам узяць пытанне на кантроль.

Любоў Аляксандраўна з вёскі Сосны паскардзілася на шумных суседзяў. Жанчына жыве ў чатырохкватэрным доме. Маўляў, не даюць нармальна жыць. Мала таго, выпіваюць, вядуць асацыяльны лад жыцця.

Начальнік Любанскага раённага аддзела ўнутраных спраў Сяргей Абрамовіч канстатаваў, што за апошнія пяць гадоў Любоў Аляксандраўна шаснаццаць разоў звярталася ў органы правапарадку. Супрацоўнікі міліцыі неаднойчы выязджалі на месца. Двух мужчын прыцягнулі да адказнасці за ўжыванне спіртнога, з беспрацоўнай маладой жанчынай правялі прафілактычную размову, а сельсавет прапанаваў ёй работу. Іншых значных правапарушэнняў не выяўлена. І ўсё ж старшыня Мінаблвыканкама даручыў узяць сітуацыю пад жорсткі кантроль, каб папярэдзіць розныя непрадбачанасці.

Дырэктар Любанскай дзіцячай школы мастацтваў Ала Каткавец хадайнічала аб выдзяленні сродкаў для ўладкавання часткі трэцяга паверха будынка. Установа расшыраецца, адкрываюцца новыя аддзяленні. Харэаграфіяй, напрыклад, займаюцца 70 чалавек. Мэтазгодна раздзяліць вучняў на два класы. Але няма такой магчымасці, паколькі не хапае памяшканняў. Анатоль Ісачанка прапанаваў спецыялістам вывучыць гэтае пытанне і пры неабходнасці расшырэння — падумаць над праектам.

Мікалай Мікалаевіч з Любані скардзіўся, што жыллёва-камунальная гаспадарка не дазваляе яму добраўпарадкоўваць тэрыторыю каля пад'езда дома, дзе ён жыве.

— Ніхто не забараняе. Калі ласка, няхай працуе, мы гэта толькі вітаем. Па заяўцы Мікалая Мікалаевіча выдзялялі тэхніку для вывазу смецця, пасадачны матэрыял, — сцвярджаюць прадстаўнікі ЖКГ.

— Што вам перашкаджае наводзіць парадак? Чым дапамагчы? — звярнуўся кіраўнік цэнтральнага рэгіёна да мужчыны.

— Каб дазволілі азеляненне тэрыторыі каля пад'езда і выдалі па пяць саджанцаў кіпарыса, самшыта, барбарысу чырвонага...

— Выдзеліце ўчастак, узаконьце яго, сфатаграфуйце і вазьміце афіцыйна распіску. Няхай спецыялісты пакажуць, якая павінна быць зялёная экспазіцыя каля ўсяго дома, а не толькі пад вокнамі заяўніка, — рэзюмаваў Анатоль Ісачанка.

Іну Божку і Людмілу Гарэльку хвалявалі адразу тры пытанні. Але, бадай, адно з найважнейшых — капітальны рамонт васьмікватэрнага дома па вуліцы Кірава, дзе яны жывуць. У кватэрах няма ні цэнтральнага ацяплення, ні газу, ні вады. Праектам гэтыя выгоды прадугледжаны, але, каб уладкаваць санвузлы, газавыя катлы ды іншае, неабходна перанесці сцены ў кватэрах дзесьці на трыццаць сантыметраў, што не задавальняе гаспадынь.

Як кажуць, лепш адзін раз убачыць, чым сем разоў пачуць. Пасля заканчэння прыёму Анатоль Міхайлавіч паабяцаў наведаць кватэры заяўніц.

Навіна, што сам губернатар прыедзе разбірацца ў сітуацыі, прымусіла жыхароў выйсці на вуліцу.

— Неабходна на 30 сантыметраў перасунуць сцяну, каб уладкаваць душ, ванну, туалет і правесці каналізацыю. Нам выдзелілі жыллё ў падменным фондзе. Суседзі з першай і трэцяй кватэр не хочуць высяляцца. Я казала, каб выселілі сілай, з канвоем, — выказвае незадаволенасць Ніна Насовіч. — Я хоць сёння збяруся і з'еду. Мы — пажылыя людзі, нам цяжка насіць ваду з калонкі, дровы з двара.

— А дзе ж грошы ўзяць на гэты рамонт, — уздыхае адна з пенсіянерак.

— Нічога, дадуць крэдыты, паціху разлічымся, — парыруе Ніна Васілеўна...

Праз колькі часу пад'ехаў Анатоль Ісачанка і падняўся ў адну з кватэр, каб ацаніць сітуацыю. Пасля сустрэчы з уладальнікамі жылля ён расказаў журналістам:

— Я думаю, мы знайшлі кампраміс з жыхарамі. Спецыялісты выпрацуюць варыянт, які б задаволіў і людзей, і ўлады. Праз тыдзень-другі ім прапануюць тое, што мы хочам рабіць, або тое, што яны хочуць бачыць. У выніку будзе прынята адпаведнае рашэнне.

— Думаю, з дапамогай губернатара пытанне будзе вырашана станоўча, — радуецца Людміла Гарэлька. — Анатоль Міхайлавіч паглядзеў кватэру, мы яму даступна растлумачылі сутнасць праблемы. Пажылыя людзі пагадзіліся з праектам, бо ім не сказалі, што перанос сцен цягне за сабой дадатковыя затраты, паколькі работы будуць праведзены за наш кошт: з кожнай кватэры належыць па сем тысяч рублёў. Акрамя таго, у нас невялікія па плошчы жылыя памяшканні, а пасля пераносу сцен тут наогул будзе не размінуцца.

Што ж, сапраўды, пасля ўмяшання старшыні Мінаблвыканкама з'явілася надзея, што нарэшце паразуменне будзе дасягнутае. А праз год-другі аб вадзе з калонкі і пахіленых трухлявых падсобных памяшканнях на вуліцы застануцца толькі ўспаміны.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Гомельшчына чакае ўдзельнікаў форуму

Усе беларускія вобласці і 14 украінскіх прымуць удзел у прадстаўленні патэнцыялу эканамічнага супрацоўніцтва падчас I Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны, які адбудзецца 25—26 кастрычніка ў Гомелі.

Экспазіцыя разгорнецца на дзвюх пляцоўках у горадзе над Сожам. Свае магчымасці прадэманструюць 57 украінскіх і 89 беларускіх кампаній. Пройдуць прэзентацыі рэгіёнаў, прадпрыемстваў, кампаній і арганізацый, а таксама перамовы і кансультацыйныя саветы з удзелам звыш 250 прадстаўнікоў бізнесу і дзелавых колаў.

На пасяджэнні, напрыклад, Дняпроўскага басейнавага савета абмяркуюць распрацоўку праекта плана кіравання басейнам ракі Днепр. Стратэгіяй будуць вызначаны дзеянні беларускага і ўкраінскага бакоў, якія датычацца маніторынгу водаў, кантролю якасці вады, выканання гідралагічнага рэжыму і гэтак далей. Таксама будуць вывучацца вынікі інвентарызацыі водных аб'ектаў Гомельскай вобласці. Плануецца абмеркаваць каардынацыю пытанняў аховы і ўстойлівага выкарыстання трансгранічных прыродаахоўных тэрыторый.

Беларускія і ўкраінскія навукоўцы будуць весці размову пра новыя метады барацьбы з усыханнем хваёвых лясоў на канферэнцыі «Перспектыўныя кірункі і механізмы развіцця супрацоўніцтва ў галіне навукі і тэхналогій». У ёй прымуць удзел па дзевяць навуковых інстытутаў Украіны і Беларусі. Будзе разглядацца ў тым ліку магчымасць касмічнага зандзіравання насаджэнняў для выяўлення пашкоджання на ранніх стадыях, а таксама супрацоўніцтва ў вобласці генетыкі, селекцыі, лесааднаўлення, прыродакарыстання. Яшчэ адной актуальнай тэмай, якую абмяркуюць спецыялісты дзвюх краін, стане ўзаемадзеянне па барацьбе з ляснымі пажарамі трансгранічнага характару.

На працягу двух дзён больш за 100 прадстаўнікоў вышэйшай школы Беларусі і Украіны будуць абмяркоўваць актуальныя пытанні ўзаемадзеяння і пашырэння партнёрскіх стасункаў.

У гэтыя дні будзе працаваць кірмаш прадукцыі і вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Свае работы на ім прапануюць рамеснікі з Чарнігаўшчыны і Гомельшчыны, а таксама з іншых рэгіёнаў Беларусі. Унікальныя абрады і традыцыі прадэманструюць на падворках у горадзе майстроў. Больш за 500 артыстаў з Беларусі і Украіны прымуць удзел у канцэрце дружбы 25 кастрычніка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗАПАВЕТНЫЯ БІЛЕТЫ СТАНУЦЬ ДАСТУПНЫЯ

Урад зацвердзіў дату старту і правілы продажу білетаў на II Еўрапейскія гульні

Згодна з пастановай Савета Міністраў, квіткі будуць прадавацца з 1 снежня 2018 года да 30 чэрвеня 2019 года. Іх рэалізуе білетны аператар, а таксама турарганізацыі пры аказанні імі турпаслуг з адначасовым продажам квіткоў. Білет афармляецца на фірменным бланку і павінен утрымліваць абавязковыя рэквізіты, у тым ліку назву мерапрыемства, кошт і нумар білета. Па адным білеце (копіі электроннага білета) дапускаецца аднаразовы ўезд у Беларусь толькі аднаго замежнага грамадзяніна або асобы без грамадзянства.

Білеты могуць быць вернутыя ў выпадку адмены Еўрапейскіх гульняў або адмовы ва ўездзе ў Беларусь па падставах, прадугледжаных заканадаўствам. Пры вяртанні ўладальніку вяртаецца кошт білета роўны кошту яго набыцця. Як паведамлялася раней, дызайн квіткоў ужо распрацаваны і зацверджаны.

Мяркуецца, што бліжэй да старту спаборніцтваў білеты можна будзе набыць не толькі ў інтэрнэце, але і ў касах Мінска і іншых гарадоў Беларусі, а таксама ў 400 пунктах афлайн-продажаў сеткі партнёраў кампаніі «Тыкетпро».

Дакументам таксама зацверджана палажэнне аб парадку выдачы заключэнняў, якія пацвярджаюць выкарыстанне, спажыванне, прызнанне непрыдатнасці тавараў для іх далейшага выкарыстання, іх бясплатную раздачу, уручэнне ўдзельнікам II Еўрапейскіх гульняў 2019 года ў якасці ўзнагародных атрыбутаў, знішчэнне і (або) беззваротную страту.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пуцін і Трамп сустрэнуцца ў Парыжы

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падчас сваёй маючай адбыцца паездкі ў Парыж 11 лістапада сустрэнецца з амерыканскім калегам Дональдам Трампам. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на памочніка расійскага прэзідэнта Юрыя Ушакова. Па яго словах, падчас кансультацый паміж памочнікам прэзідэнта ЗША па нацбяспецы Джонам Болтанам і прадстаўнікамі расійскай знешнепалітычнай і ваенна-палітычнай каманды бакі дасягнулі папярэдняй дамоўленасці аб магчымасці правядзення кантакту двух прэзідэнтаў у Парыжы на мерапрыемствах у сувязі са стагоддзем заканчэння Першай сусветнай вайны. Ушакоў дадаў, што адпаведную дамоўленасць Пуцін пацвердзіў у ходзе сваёй гутаркі з Болтанам. Плануецца, што пасля ўрачыстых мерапрыемстваў у Парыжы «прэзідэнты правядуць двухбаковую сустрэчу». Юрый Ушакоў паведаміў РІА «Навіны», што гаворка можа ісці аб «паўнавартаснай сустрэчы», у якой акрамя прэзідэнтаў возьмуць удзел ключавыя чыноўнікі з абодвух бакоў. Як вядома, апошняя сустрэча прэзідэнтаў Пуціна і Трампа прайшла 16 ліпеня ў Хельсінкі, да гэтага адбыліся яшчэ дзве сустрэчы — 7 ліпеня 2017 года на палях саміту Групы дваццаці ў Гамбургу і ў лістападзе таго ж года на саміце АТЭС у В'етнаме.

Італія пайшла супраць Еўрасаюза

Еўрасаюз запатрабаваў ад Італіі перагледзець арыенціры бюджэту, перадаюць «Весткі. Эканоміка». Удакладняецца, што патрабаванне прад'яўлена ў рамках беспрэцэдэнтнага кроку. У адказ на гэта патрабаванне прэм'ер-міністр Італіі Джузэпэ Контэ паведаміў, што ў яго ўрада няма запаснога плана па бюджэце. Ён паабяцаў растлумачыць праект бюджэту краіны на наступны год еўракамісарам за некалькі гадзін да таго, як тыя прынялі рашэнне адхіліць бюджэт Італіі. Пра гэта паведамляе Bloomberg. Контэ паведаміў таксама ў інтэрв'ю агенцтву, што Італія пайшла супраць Еўрасаюза, паколькі не мае магчымасцяў для змены фактычных расходаў, хоць у краіны ёсць «пэўная гнуткасць для змены аспектаў плана». Прэм'ер таксама паведаміў, што калі б да яго звярнуліся з просьбай змяніць сутнасць, «гэта было б цяжка, паколькі ён не можа пагадзіцца на гэта». «Няма ніякага плана Б. Я казаў, што дэфіцыт у 2,4 працэнта ВУП — гэта паталок», — паведаміў Контэ. Варта адзначыць, што гэта першы выпадак у гісторыі, калі Еўракамісія просіць дзяржаву ЕС перагледзець бюджэтны план і прадставіць на зацвярджэнне новы праект.

Саудаўская Аравія абрынула цэны на нафту

Заявы міністра энергетыкі Саудаўскай Аравіі Халіда аль-Фаліха пра намер АПЕК нарасціць здабычу да максімуму абрынулі сусветныя цэны на нафту. Гэтая краіна мае намер дамагацца істотнага зніжэння цэн на «чорнае золата» з мэтай нанесці максімальную шкоду іранскай эканоміцы і кампенсаваць спад прапановы пасля ўвядзення санкцый у дачыненні да Ірана. Паведамляецца, цана на нафту маркі Brent упала на 4 працэнты і склала 76,65 долара за бараль, нафта маркі WTI страціла ў цане крыху менш за 3,73 працэнта — да 66,67 долара за бараль. Як паведаміў аль-Фаліх, АПЕК плануе нарасціць здабычу нафты з пачатку лістапада. Эксперты ўпэўнены, што падобныя дзеянні саудаўцаў прывядуць да такой сітуацыі на рынку нафты, калі цана за бараль нафты можа абрынуцца да 68 долараў. Нагадаем, раней Саудаўская Аравія абвясціла аб гатоўнасці нарасціць здабычу нафты на 200—300 тысяч бараляў у дзень на сусветны рынак у наступныя два месяцы ў мэтах кампенсацыі зніжэння здабычы нафты ў Іране. Каралеўства мела намер павялічыць здабычу да ўзроўню жніўня, які складаў 10,4 мільёна бараляў у дзень, каб задаволіць рост попыту з боку азіяцкіх спажыўцоў.

Прасцей атрымаць дапамогу

Сёння па ўсёй краіне — прафсаюзныя прававыя прыёмы

Ва ўсіх раённых і абласных цэнтрах краіны юрысты Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі бясплатна пракансультуюць усіх ахвотных па пытаннях, звязаных з абаронай працоўных правоў і сацыяльна-эканамічных інтарэсаў. Прыёмы пройдуць як у раённых, гарадскіх аб'яднаннях прафсаюзаў, так і непасрэдна ў арганізацыях, якія знаходзяцца на тэрыторыі раёнаў і гарадоў.

Толькі за першае паўгоддзе 2018 года юрысты ФПБ правялі амаль 80 тысяч кансультацый па працоўных і звязаным з імі пытаннях. Пры непасрэдным удзеле прафсаюзаў адноўлена на рабоце 39 чалавек, людзям вярнулі нявыплачаных або незаконна ўтрыманых грашовых сродкаў у суме больш за 2 млн рублёў.

З лістапада мінулага года ў шэрагу рэгіёнаў падчас прававых прыёмаў да прафсаюзных юрыстаў далучаюцца супрацоўнікі пракуратуры. Асаблівая ўвага на такіх прыёмах аддаецца выкананню наймальнікамі гарантый у галіне працы, парадку і тэрмінаў выплаты зарплаты, а таксама ўсіх сум, якія належаць работніку пры звальненні.

Як адзначаюць у прэс-цэнтры ФПБ, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі пастаянна праводзіць юрыдычныя кансультацыі грамадзян. Звярнуцца можна па тэлефоне, прыйсці на асабісты прыём, пакінуць пісьмовы або электронны зварот.

А на гэтым тыдні на інтэрнэт-партале ФПБ стартаваў новы сэрвіс, на якім прадстаўлены прафсаюзныя юрысты па ўсіх рэгіёнах і галінах. Для звароту чалавеку дастаткова пазначыць свой раён і сферу дзейнасці, і праграма сама прапануе прававых інспектараў, якія змогуць найбольш эфектыўна яму дапамагчы. Мяркуецца, што такім чынам членам прафсаюза стане яшчэ прасцей і хутчэй атрымаць дапамогу кваліфікаванага юрыста.

Святлана БУСЬКО.

УСЕ КНІГІ — ДА НАС

XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш пройдзе ў лютым 2019 года

Традыцыйная кніжная выстаўка-кірмаш пройдзе ў Мінску з 6 да 10 лютага 2019 года. Размова аб гэтым ішла на арганізацыйным камітэце ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Пасяджэнне вёў намеснік міністра інфармацыі краіны Ігар БУЗОЎСКІ. Адрасам правядзення прэстыжнага кніжнага форуму будзе адміністрацыйны комплекс па праспекце Пераможцаў, 14. Краіна — Ганаровы госць выстаўкі-кірмашу ў 2019 годзе — Злучаныя Штаты Амерыкі.

Асноўнымі тэмамі нацыянальнай экспазіцыі на кірмашы стануць наступныя абсягі: Год малой радзімы, II Еўрапейскія гульні, юбілеі класікаў беларускай літаратуры, іншыя знакавыя даты ў жыцці нашай краіны.

Адбудзецца цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Пройдзе і чарговы — пяты па ліку — Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час». Падчас размовы на арганізацыйным камітэце гаварылася і пра шырокае выкарыстанне ў дні кірмашу для рэалізацыі яго праграмы іншых сталічных пляцовак. Найперш — бібліятэк, навучальных устаноў.

Сяргей ШЫЧКО.

Ну і ну!

«СПАЛІЎСЯ» НА САЛОДКІМ

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Савецкага РУУС сталіцы затрымалі непрацуючага раней судзімага 37-гадовага мужчыну, які ў краме адкрыта скраў 188 плітак шакаладу.

У міліцыю з заявай звярнуліся работнікі гэтага гандлёвага аб'екта. Яны расказалі, што ў краму зайшоў наведвальнік, а праз нейкі час адзін з супрацоўнікаў заўважыў, як грамадзянін хавае тавар па кішэнях і пад куртку. Калі зламысніка паклікалі, ён пачаў уцякаць.

У адносінах да затрыманага заведзена крымінальная справа за крадзеж. Мужчына можа атрымаць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да чатырох гадоў.

ЛІМОН ПАД ПІСТАЛЕТАМ...

У адной са сталічных крамаў мужчына пагражаў касіру пнеўматычным пісталетам за адмову парэзаць яму... лімон.

Па інфармацыі Следчага камітэта, да работніка крамы падышоў грамадзянін і папрасіў касіра парэзаць лімон, які ён набыў раней. Жанчына, што ў той момант разлічвала пакупнікоў, з гэтай нагоды адмовіла мужчыну. У адказ пакупнік дастаў з кішэні вопраткі прадмет, падобны на пісталет, накіраваў яго ў бок работніка крамы і прыгразіў скарыстацца ім. Пра здарэнне жанчына паведаміла ахове гандлёвага аб'екта. Неўзабаве 31-гадовага мужчыну затрымалі. Высветлілася, што ён быў нападпітку. Раней да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся. Заведзена крымінальная справа за хуліганства, здзейсненае з пагрозай выкарыстання зброі. Грамадзянін знаходзіцца пад хатнім арыштам.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБЯРЭГ ГАРАДЗЕНСКАГА КРАЮ

Унікальнае палатно з 200 лапікавых фрагментаў цяпер можа ўбачыць кожны

Творчы праект «Покрыва Свету» быў створаны да фестывалю нацыянальных культур, які праходзіў у 2012 годзе. Але затым доўгі час лапікавы шэдэўр захоўваўся па частках дзесьці ў майстэрнях, і толькі нядаўна 30-метровае покрыва стала даступна для агляду. Цяпер яго можа ўбачыць кожны, хто завітае ў Гродзенскі цэнтр рамёстваў.

Разам з метадыстам гарадскога цэнтра культуры Людмілай Лебедзь заходзім у памяшканне, дзе вісяць і ляжаць доўгія каляровыя пакрывалы. Іх тут каля дзясятка. Напачатку ўсе фрагменты былі складзены ў адзінае доўгае палатно, якое ўпершыню прадэманстравалі на дзявятым фестывалі нацыянальных культур. Падчас урачыстага шэсця покрыва, нібы абярэг, пранеслі па вуліцах горада. Але пасля фестывалю сляды ўнікальнага народнага твора дзесьці згубіліся. Як аказалася, «Покрыва Свету» разабралі майстрыхі і яно па частках ляжала ў розных падсобных памяшканнях.

— У цэнтры «Спадчына» пачалася работа па трансгранічным праекце, і майстрыхі скруцілі яго і вывезлі. Тады былі нават спрэчкі, дзе захоўваць гэта вялізнае палатно, якое дасягае 30 метраў у даўжыню і два метры ў шырыню, — расказвае Людміла Іосіфаўна. — Праз некаторы час мне ўдалося выцягнуць гэты цуд на свет божы з розных запаснікаў і размясціць для шырокага агляду ў зале нашага цэнтра «Спадчына».

Большасць фрагментаў вісіць на спецыяльных драўляных драбінах, якія дастаюць амаль да столі, яшчэ адно, самае доўгае палатно, ляжыць на вялізным стале. Ад стракатых узораў разбягаюцца вочы.

Кожнае палатно складаецца з паўметровых асобных пано, якія сшыты разам у вялізнае покрыва. Ідэя праекта належыць майстру Валянціне Цыганец, а канчатковы выгляд увасобіла кіраўнік студыі шыцця са шматкоў Алена Чумрай. Работа над покрывам доўжылася амаль два гады, — успамінае Валянціна Лебедзь.

Ідэя была стварыць агульнае покрыва з невялікіх фрагментаў на тэму сяброўства народаў. Як вядома, у Беларусі пражывае 140 нацыянальнасцяў, і прадстаўнікі многіх дыяспар прынялі ўдзел у рабоце над праектам. У творы кожны адлюстроўваў свае нацыянальныя матывы. Далучыліся да ўдзелу майстры з усіх куткоў краіны і нават замежжа.

Свае кавалкі дасылалі майстры з Расіі, Літвы, Польшчы, Латвіі і нават Ізраіля. Тэхнікі выканання самыя розныя. У асноўным, канешне, гэта пэчварк з канкрэтным сюжэтам. Ёсць ткацтва, вышыўка, батык, аплікацыі, вязанне шыдэлкам і на прутках.

— Мне вельмі падабаецца вышыўка «Кветкі Беларусі» гродзенскай майстрыхі Анастасіі Матусевіч, — кажа Людміла Іосіфаўна. — А вось гэты «Палёт на фестываль» з матылькамі прапанавала вядомая рукадзельніца з Мінска Святлана Платунова, Тамара Волах з Віцебска даслала ткацкі ўзор. Такіх пано ўсяго каля 200, і гэта сапраўдныя творчыя работы з цёплай энергетыкай, бо адлюстроўваюць і прыроду, і жывёльны свет, і дзіцячыя мары — той свет, які кожнаму дарагі і які трэба зберагчы.

Такія абярэгі, але меншыя па памеры, існуюць у Мінска і Полацка. Гэтыя гарады славяцца сваімі майстрамі шыцця са шматкоў, асобныя пано нават выстаўляліся ў гродзенскім цэнтры «Спадчына». Як аказалася, і там існавала праблема іх размяшчэння з-за вялікіх памераў. Але ў рэшце рэшт цудоўныя работы знайшлі сваё пачэснае месца і сталі даступныя для агляду. Дарэчы, частка гродзенскага покрыва знаходзіцца ў адкрытым сёлета культурным цэнтры «Фестывальны», дзе сабрана атрыбутыка і творчыя работы, прысвечаныя Рэспубліканскаму фестывалю нацыянальных культур. Фрагмент покрыва адлюстроўвае карагод дзяўчат, якія танцуюць, узяўшыся за рукі.

Ці будзе «прырастаць» гродзенскае покрыва новымі фрагментамі, пакуль невядома. Магчыма, гэты працэс працягнецца, як і сам фестываль. У кіраўніцтва цэнтра, між іншым, ёсць намер увасобіць у аналагічным палатне тэму малой радзімы. Людміла Лебедзь дзеліцца планамі па адкрыцці на базе цэнтра гуртка па шыццю са шматкоў, ці, як яго яшчэ называюць, пэчварку. У горадзе ёсць майстрыхі гэтай справы, і нават праходзяць заняткі ў адным з сацыяльных цэнтраў горада.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ХУТКА І БЕЗ ЗАТОРАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Варта адзначыць, што дарожка з'яўляецца своеасаблівай паласой размежавання транспартных патокаў. Такім чынам веласіпедысты, якія рухаюцца па вуліцы 17 Верасня, едуць па звычайным шэрым асфальце. А зялёны колер выкарыстоўваецца для пазначэння веласіпеднай дарожкі ў месцах перасячэння патокаў. А вось прыпаркаваць аўтамабіль у напрамку праспекта Машэрава справа цяпер нельга, нават ехаць тут можна не бліжэй за метр да бардзюра. Праўда, пры абнаўленні разметкі выдзелена месца для паркоўкі аўтамашын з левага боку ўздоўж праезнай часткі. Усё гэта зрабілі для стварэння бяспечных умоў руху і веласіпедыстаў, і пешаходаў, і аўто, — падкрэсліў Уладзімір Фяськоў.

Дарэчы, разметка для веласіпедаў наносіцца па асаблівай тэхналогіі: яе «малююць» халодным пластыкам у выглядзе кропак. Таму пры наездзе на яе колам аўтамабіля ствараецца шумавы эфект — так кіроўца машыны чуе, што выехаў за межы сваёй паласы руху. Матэрыял для разметкі вырабляецца на брэсцкім прадпрыемстве групы кампаній «СТіМ». Прадстаўнік фірмы, яе **дырэктар па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху і транспартнай мабільнасці Сяргей ТАЛАТАЙ,** дарэчы, былы начальнік абласной Дзяржаўтаінспекцыі, сцвярджае, што выкарыстоўваецца інавацыйны для нашых умоў матэрыял. Ён трывалы, не патрабуе пастаяннага абнаўлення, як фарбы. Асаблівасць у тым, што матэрыял наносіцца так званым структурным спосабам, інакш кажучы, кропкамі. Гэта дазваляе дрэніраваць вадкасць: калі ідзе дождж, вада праходзіць паміж элементамі разметкі, а часткі адлюстравання, так званыя шклашарыкі, застаюцца зверху, што дазваляе адлюстроўваць назад святло ад фар аўтамабіля. Гэта не брэсцкая знаходка. Так робяць у Еўропе. І «СТіМ» — як вытворца разметкі — ажыццяўляе гэты праект-эксперымент разам з гарвыканкамам і Дзяржаўтаінспекцыяй.

Між іншым, для развіцця веларуху прымаюцца і іншыя захады. Напрыклад, з'явілася ідэя арганізаваць да 1000-годдзя Брэста веласіпеднае кольца з пяццю пунктамі пракату двухколавага транспарту. Такім чынам кожны ахвотны атрымае магчымасць адправіцца на экскурсію па горадзе экалагічным транспартам. Узяць веласіпед турысты і гараджане змогуць на вуліцы Арджанікідзэ ў раёне чыгуначнага і ў хуткім часе аўтавакзалаў. Праз вуліцы Камсамольскую, 17 Верасня, Міцкевіча яны выедуць на праспект Машэрава і накіруюцца ў Брэсцкую крэпасць. Паколькі пункты велапракату размесцяцца па ўсім кольцы, ахвотныя могуць пакідаць веласіпед на адным з этапаў і працягваць прагулку пехатой, а затым зноў браць «веламашыну» і рухацца далей. Пункты пракату плануюць размясціць недалёка ад помніка 1000-годдзю Брэста, каля ЦУМа, гасцініцы «Інтурыст», у раёне крэпасці.

Аўтары ідэі лічаць, што ў выпадку арганізацыі веладарожак у межах праезнай часткі горад стане больш мабільны, а затораў будзе ўзнікаць менш. Любы жыхар горада зможа ўзяць веласіпед у адным пункце, даехаць у другі і пакінуць веласіпед. Прадугледжваецца сістэма абанементаў на карыстанне двухколавым транспартам: сутачныя, дэкадныя, месячныя і нават сезонныя (з красавіка да кастрычніка). Кошт месячнага абанемента абяцаюць у раёне чатырох долараў у эквіваленце. І гэта будзе вельмі зручна і камфортна. Навошта браць машыну, калі запланавана паездка на адлегласць у чатыры-пяць кіламетраў? А так узяў веласіпед, праехаўся і атрымаў карысную для здароўя трэніроўку мышцаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

❍ А ЯК У ІХ?

У Пекіне паслугамі велапракату дапаможа скарыстацца... мабільнік

Сетка грамадскага транспарту на двух колах — самая даступная ў кітайскай сталіцы. Аб гэтым сведчыць танны кошт арэнды — 1 юань.

Для таго каб чытачу стала зразумела, колькі гэта, растлумачу: 1 долар можна набыць амаль за 7 юаняў. Усе астатнія віды грамадскага транспарту каштуюць болей, чым юань. Напрыклад, паездка ў пекінскай «падземцы» будзе каштаваць мінімум 3 юані на адлегласць у некалькі станцый, дзе цана залежыць ад колькасці прыпынкаў. Такі ж прынцып і ў гарадскіх аўтобусаў: чым далей трэба ехаць, тым даражэйшая паездка.

А вось веласіпед — як экалагічны від транспарту — адзін з самых распраўсюджаных у кітайскай сталіцы. Менавіта таму выклікае непаддзельнае захапленне, калі ўпершыню бачыш сотню (ніяк не меней!) прыпаркаваных абапал дарогі двухколавых жоўценькіх ці аранжавых «ластавак». І гэтая карцінка сустракае цябе амаль паўсюдна.

Аднак жа проста сесці і пачаць круціць педалі не атрымаецца — спачатку неабходна аплаціць арэнду, разблакаваўшы веласіпед з дапамогай мабільніка.

Як гэта працуе? Хто бываў у Кітае, ведае — трэба скарыстацца мясцовай сацсеткай WiChat, якая, акрамя звычайных віртуальных зносін, адначасова выконвае і функцыю... кашалька, бо мае прывязку да банкаўскай карткі. Скануючы qr-коды, жыхары сталіцы разлічваюцца за пакупкі ў крамах, наведванне культурных мерапрыемстваў, басейнаў, паездкі на грамадскім транспарце ды іншае. Безумоўна, для турыста гэта крыху незразумела і нязвыкла, бо ўзровень лічбавізацыі ў нас іншы. Але скарыстацца, напрыклад, грамадскім веласіпедам раю ўсім — дастаткова папрасіць аб гэтым любога мінака, які з радасцю (кітайцы вельмі добра ставяцца да замежнікаў і нядрэнна размаўляюць па-англійску) разблакуе вам двухколавы транспарт, нават не ўзяўшы за гэта грошы. Прэзент, адным словам.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.

❍ ДА ТЭМЫ

У Гродне экскурсію па гістарычнай частцы горада можна здзейсніць на веласіпедзе

Сетка велапракату «ВелаСтарт» існуе ўжо трэці сезон і карыстаецца попытам. Як расказаў **генеральны дырэктар КУП «Гроднааблкінавідэапракат»** (менавіта гэтаму прадпрыемству належыць пракат) **Юрый АЛЯКСЕЙ**, укладанні акупіліся ў першы ж сезон выкарыстання. 42 веласіпеды набылі яшчэ ў 2016 годзе і прапанавалі скарыстацца паслугамі пракату ўсім ахвотным да гэтага віду транспарту.

Дарэчы, пракаты месцяцца каля гарадскіх кінатэатраў, што вельмі зручна для тых, хто хоча не толькі пракаціцца з кропкі А ў кропку Б, але і адпачыць з камфортам ці падсілкавацца ў кафэ мясцовых кінатэатраў.

Важная акалічнасць: двухколавы транспарт можна пакідаць у любым з пунктаў велапракату (а іх па горадзе пяць) і пешшу працягваць экскурсію. Як паведаміў суразмоўнік, супрацоўнікі прадпрыемства распрацавалі тры займальныя тэматычныя веламаршруты па цэнтральнай частцы горада, здзейсніўшы якія можна даведацца аб унікальнай гісторыі старажытнага Гродна.

— Хто больш за ўсё карыстаецца паслугамі велапракату? — спытала ў візаві.

— Безумоўна, актыўная моладзь, студэнты-замежнікі, што навучаюцца ў гродзенскіх ВНУ, і бязвізавыя турысты, — атрымала адказ.

Між іншым, паспяховы бізнес на двух колах будзе развівацца і надалей, запэўніў Юрый Аляксей. Не раскрываючы ўсіх цікавінак, суразмоўнік паведаміў, што да наступнага сезона ў горадзе павінны з'явіцца велапаркоўкі з нараднымі прыстасаваннямі для мабільных тэлефонаў, а таксама мэтанакіравана будуць распрацоўвацца прапановы для бязвізавых турыстаў, якіх у Гродне пабывала ўжо больш за 70 тысяч чалавек.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Сямейная газета

Выпуск № 20 (111)

Помніш, як тады?

Па сацыяльных сетках яшчэ дагэтуль гуляе рэха стыхійнага настальгічнага флэшмобу, прысвечанага 90-м гадам ужо мінулага стагоддзя. Розныя людзі выкладваюць здымкі — каляровыя і чорна-белыя, зробленыя на «стужку» альбо паларoідныя, якія так ці інакш нясуць у сабе адбітак эпохі. У кагосьці — гэта ўспаміны пра піянерскія летнікі, у кагосьці — пра заводскія прахадныя ці лабараторыі НДІ, на здымках — модныя ласіны і спадніцы-«ламбады», спартыўныя касцюмы «Adidas» і дзявочыя чубчыкі, пастаўленыя дыбкі з дапамогай цукру з вадой (бо лак для валасоў быў далёка не ўсім па кішэні), яркія пакеты з кідкімі фота і надпіскамі, постары замежных выканаўцаў і аўдыякасеты з рэдкімі аўдыязапісамі, якія дзеля эканоміі перамотвалі з дапамогай алоўка ці шарыкавай ручкі, дыскеты 3,5, пэйджары і розная іншая, «прасунутая» на той час, тэхніка... Самай маладой з удзельнікаў флэшмобу — прынамсі, каго ведаю асабіста я — у 1990-м быў усяго год, але і яна прызналася, што, разглядаючы зробленыя ў дзіцячым садку фота 25-гадовай даўніны, адчувае пэўную настальгію. І хоць пазней гэты элегічны экскурс у мінулае жыццё некаторыя даследчыкі медыйнай сферы назвалі «зрэжысіраванай прапагандысцкай акцыяй, закліканай абяліць «цяжкія 90-я», большасці ўдзельнікаў, мяркуючы па водгуках, было прыемна ўспомніць уласнае дзяцінства і юнацтва або маладосць бацькоў.

Насамрэч, настальгія па тым, якая раней была зелянейшая трава, — з'ява вечная, якая, напэўна, не залежыць ад краіны і эпохі. І хоць тэрмін «настальгія» швейцарскі ўрач Іаган Хофер увёў у карыстанне толькі ў 1688 годзе, але пачуццё суму па бацькоўскім доме, па далёкай радзіме, па страчаных сябрах, па ўчарашнім часе наогул вядомае са старажытных часоў (успомнім гамераўскага Адысея).
І ведаеце што? Калі напачатку настальгію лічылі літаральна хваробай і сімптомам сур'ёзнага разладу, то потым псіхолагі прыйшлі да высновы, што настальгія... карысная. Бо гэта яна ратуе нас ад самоты і дазваляе адаптавацца ў складаных умовах, робіць больш гасціннымі і цярпімымі да іншаземцаў. Спецыялісты сцвярджаюць, што агульныя ўспаміны — безумоўна, гаворка пра пазітыўныя — мацней звязваюць сямейныя пары. І нават горкі смак незваротнай страты, сум па мінулым дапамагае натхнёна жыць у бягучым часе, цаніць тое, што маеш, і з верай у лепшае глядзець у будучыню. Словам, «успомніла бабка, як дзеўкай была» — гэта не смешна і не сорамна, а цікава і карысна.

Так што, жывучы сёння, тут і цяпер, імкліва бегучы за птушкай шчасця заўтрашняга дня, час ад часу прыпыняйцеся, каб азірнуцца назад, успомніць свае карані і карэньчыкі, дзядоў і прадзедаў, «капнуць» мінулае так глыбока, як толькі зможаце. Клубок памяці — бясцэнная штука, і не толькі напярэдадні свята Дзядоў, а наогул. Успамінаючы цёмныя палосы, мы імкнёмся прыкласці ўсе намаганні, каб падобнае не паўтарылася наноў, перабіраючы светлыя, — адчуваем натхненне жыць. І зусім не важна, што паслужыць для гэтага штуршком: фотапрывітанне з 90-х або 60-х, дзядулевы «тэхнічныя дыназаўры» на гарышчы ці маміна вясельная сукенка з далёкага кутка шафы.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Быць разам

КАЛЫХАНКА АД «АЎРЫ»

Юлія Быкава і Яўген Алейнік — пра творчасць, побыт, выхаванне і пра тое, з чаго пачынаецца Радзіма

Урач і эканаміст, спявачка і кампазітар, паэтка, якая з аднолькавым імпэтам піша на рускай, беларускай, англійскай, французскай і іншых мовах, і музыкант, якога смела можна назваць чалавекам-аркестрам, бо ён іграе на гітары, баяне, клавішных... А яшчэ яны — бацькі дваіх сыноў, музычны гурт «Аўра» і аўтары больш чым 300 песень, якія гучаць у розных краінах свету. І, мабыць, адна з самых трывалых сямейных пар беларускай сцэны.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

Каштоўнасці

З КІМ ДА ВЯНЦА — З ТЫМ ДА КАНЦА?

Чым варта кіравацца, заключаючы царкоўны шлюб

У дарэвалюцыйныя часы вянчанне было адзіным варыянтам для тых, хто хацеў пабрацца шлюбам. Пры гэтым у 1897 годзе паводле перапісу насельніцтва на тысячу жанатых мужчын прыходзіўся толькі адзін разведзены. Паказчык з разраду фантастыкі, улічваючы сучасную статыстыку разводаў (у Беларусі распадаецца кожная другая сям'я). Ці дапамагае сёння царкоўны шлюб зберагчы лад у сям'і? Як мянялася стаўленне да вянчання ў апошнія 20 гадоў? Якіх прынцыпаў прытрымлівацца, калі хочаш пражыць усё жыццё з адным чалавекам?

ЛЕПШ МЕНШ, ДЫ ЛЕПШ

— Пік вянчанняў прыйшоўся на першую палову 90-х гадоў. Пасля распаду СССР, дзе атэізм быў замацаваны на дзяржаўным узроўні, людзі масава кінуліся ў царкоўныя шлюбы. Таінства праводзілі без належнай падрыхтоўкі і нават без дакумента з загса. Гэта прывяло да пэўнай блытаніны. Мелі месца сітуацыі, калі людзі былі венчаныя з аднымі, распісаныя з другімі, а жылі з трэцімі. Чаму так? Дзесяцігоддзі афіцыйнай забароны рэлігіі нанеслі адбітак: людзі проста не разумелі сэнсу вянчанняў, — тлумачыць **старшыня Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы, доктар тэалогіі протаіерэй Сергій ЛЕПІН.** — З цягам часу духавенства ў царкве стала больш, з'явілася магчымасць рыхтаваць да таінства кожную пару асобна. Пачалі праводзіцца спецыяльныя гутаркі з маладымі. Такі падыход адсеяў тых, хто разглядаў царкоўны шлюб як магчымасць прыгожай фотасесіі і яшчэ адзін «цікавы» пункт вясельнай праграмы. Выбачайце за іронію, але знаходзіліся тыя, хто разважаў прыблізна так: «Можна ў цырк, а можна ў царкву, можна лебедзяў пакарміць, а можна павянчацца. Рамантыка, чо!»

Змяншэнне колькасці вянчанняў у наш час звязана і з абясцэньваннем самога шлюбу як з'явы. Многія цяпер выбіраюць сужыццё. Хоць яно па сваёй сутнасці бывае розным. Адны жывуць разам і лічаць, што яны ў шлюбе, толькі незарэгістраваным. Іншыя ўвогуле не прызнаюць сям'ю як форму адносін паміж людзьмі і даказваюць, што ніхто нікому нічога не павінен. Маўляў, штамп на пачуцці не ўплывае.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

АБ ШЛЮБЕ, СЯМ'І І КАР'ЕРЫ

Беларускі саюз жанчын правёў круглы стол па пытаннях павышэння прэстыжу інстытута сям'і і ўмацавання здароўя жанчын. Акрамя членаў гэтай грамадскай арганізацыі, надзённыя праблемы абмеркавалі прадстаўнікі міністэрстваў аховы здароўя, працы і сацыяльнай абароны, інфармацыі, а таксама сталічнага і рэгіянальнага цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання, грамадскага аб'яднання шматдзетных бацькоў і іншыя.

Намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын (БСЖ), ганаровы прафесар факультэта журналістыкі БДУ Лілія АНАНІЧ паведаміла, што ў Беларусі 5 084 580 жанчын (53 %). У складзе БСЖ іх 130 тысяч.

— Гэта вялікі энергетычны патэнцыял. А ініцыятывы Беларускага саюза жанчын падтрымліваюцца на дзяржаўным узроўні, — падкрэсліла Лілія Ананіч, заклікаўшы ўдзельніц круглага стала да абмеркавання найперш праблемных пытанняў.

Беларуская жанчына: хто яна?

Пра тое, як сёння выглядае сяроднестатыстычная беларуская жанчына і як яна змянілася за чвэрць стагоддзя (з 1992 года), расказала **намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын Антаніна МОРАВА**. Сярэдні ўзрост беларускі — 42,8 года (37,6 у 1992 годзе). Жыць мы сталі даўжэй: працягласць жыцця павялічылася на 3,7 года, прычым у горадзе яна выросла на 4,2 года, у вёсцы — на 3,6. А вось нараджаць нашы суайчыннікі сталі пазней: першае дзіця — ва ўзросце 26,5 года (на 3,6 года пазней, чым у 1992-м). Адпаведна, у шлюб сённяшняя беларуска ўступае таксама пазней — у 25,8 года (раней у 22,4).

Як сведчыць статыстыка, сяроднестатыстычная беларуская жанчына добра адукаваная і вялікая працаўніца: 37 % беларусак маюць вышэйшую адукацыю і аддаюць працы ў сяроднім 38 гадзін у тыдзень. Апошні паказчык, дарэчы, адзін з самых высокіх у Еўропе. Акрамя занятасці на рабоце, каля 26 гадзін у тыдзень жанчына прысвячае вядзенню хатняй гаспадаркі. Чвэрць гэтага часу ідзе на догляд непаўналетніх дзяцей. Увогуле ў беларускіх жанчын высокая ступень занятасці: 91 % жанчын, якія маюць непаўналетніх дзяцей, працуюць. Прычым нярэдка сумяшчаюць сям'ю і вядзенне хатняй гаспадаркі з работай на высокай пасадзе: 40 % жанчын-кіраўнікоў маюць непаўналетніх дзяцей. Увогуле ў Беларусі амаль палова (48 %) жанчын-кіраўнікоў, 33 % першых асоб (кіраўнікоў) у розных арганізацыях — прадстаўніцы прыгожай паловы.

На варце здароўя — сучасныя тэхналогіі

— Калі ў жанчыны столькі абавязкаў, ёй проста неабходна мець моцнае здароўе, — працягнула тэму **намеснік дырэктара па акушэрстве і гінекалогіі РНПЦ «Маці і дзіця» Святлана НАГІБОВІЧ.**

Яна засяродзіла ўвагу на праблеме дэмаграфічнай бяспекі і адзначыла, што каэфіцыент нараджальнасці сёння не вельмі радуе. Ён складае (па выніках за 2017 год) 1,54. У той час як дзяржаўная праграма «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» прадугледжвае яго на ўзроўні 1,94.

— Больш за палову беларусак нараджаюць паўторна. Аднак не сакрэт, што жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту становіцца менш. І іх варта падтрымаць у нараджэнні другога, трэцяга, чацвёртага дзіцяці, — адзначыла Святлана Нагібовіч.

Міністэрства аховы здароўя, у сваю чаргу, падтрымлівае будучых мам і ў плане асветы. На гэта, у прыватнасці, накіраваны інтэрнэт-праект MamaPro.

— Мы разам са спецыялістамі — педыятрамі, неанатолагамі, гінеколагамі, псіхолагамі — выязджаем у кожны рэгіён, запрашаем будучых матуль, навучаем, каб не было страхаў перад мацярынствам. Увогуле ж здароўе будучай маці пачынаецца яшчэ ўнутрывантробна, — падкрэсліла Святлана Нагібовіч.

Яна расказала, што 2/3 цяжарных жанчын маюць экстрагенітальныя паталогіі. Занепакоенасць спецыялістаў выклікаюць такія сацыяльныя хваробы, як цукровы дыябет, метабалічны сіндром, сардэчна-сасудзістыя і анкалагічныя хваробы будучых матуль. Але нават з самымі цяжкімі захворваннямі жанчына мае не толькі ўсе шанцы нарадзіць, але і радавацца мацярынству:

— Штогод у краіне на ўлік у жаночых кансультацыях становіцца каля 100 тысяч цяжарных жанчын. І тыя, хто мае цяжкія хваробы, праходзяць праз высокатэхналагічную дапамогу, якая ёсць у нашай краіне. Усё самае сучаснае, што існуе сёння ў медыцыне ў свеце, у нас ёсць, і гэта дае магчымасць жанчыне нарадзіць здаровае дзіця. Пра многія выпадкі не ўсе нават ведаюць. Напрыклад, калі жанчыне ў раннім пасляродавым перыядзе, праз два месяцы пасля нараджэння дзіцяці, было перасаджана сэрца. Сёння медыцына змянілася: медыкі па-іншаму ставяцца да хворага. Наша мэта — працаваць на пацыента. У аказанне медыцынскай дапамогі жанчыне ўцягнутыя ўсе спецыялісты: нейрахірургі і неўролагі, анколагі, кардыёлагі, эндаваскулярныя хірургі, — заўважыла Святлана Нагібовіч.

У пацвярджэнне яе слоў **Кацярына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Першамайскай раённай арганізацыі шматдзетных бацькоў горада Мінска,** прывяла ўласны прыклад:

— На другія суткі пасля нараджэння майго сына прааперыравалі ў Дзіцячым хірургічным цэнтры. Адносіны ўрачоў да нас былі выдатныя. Сыну, дарэчы, ужо хутка споўніцца 18. А ўсяго ў мяне шасцёра дзяцей, і я ганаруся, што я — шматдзетная маці.

На сям'і не эканомім

Аб дзяржаўнай падтрымцы сям'і расказала **кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ.** Яна адзначыла, што дзяржава ніколі не эканоміла на сем'ях, а старалася ў меру магчымасці іх падтрымліваць. За апошнія 10 гадоў сацыяльныя і асабліва эканамічныя меры падтрымкі істотна павялічыліся. У прыватнасці, у 2 разы выросла дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці. Дапамога па доглядзе дзіцяці да трох гадоў прывязана да сяроднямесячнага заробку і таксама павялічана амаль удвая. Сёння яна большая, чым мінімальны заробак, і з'яўляецца істотнай падтрымкай.

Паводле слоў Святланы Белаш, у нашай краіне актыўна развіваецца сфера сацыяльных паслуг, у прыватнасці, для сем'яў, дзе бацькі ці дзеці маюць інваліднасць. Тым часам любая сям'я, дзе ёсць дзеці, можа звярнуцца ў сацыяльны цэнтр і атрымаць кансультацыйную юрыдычную, псіхалагічную ці іншую дапамогу.

— На дзяржаўным узроўні ёсць разуменне наяўнасці жыллёвых праблем у шматдзетных сем'яў, і памеры фінансавай падтрымкі пры будаўніцтве жылля павялічваюцца. Уведзена праграма «Сямейны капітал», і яна паказала сваю эфектыўнасць: калі 10 гадоў таму, па даных перапісу, у Беларусі было 62,5 тысячы шматдзетных сем'яў, то зараз па звестках статыстычных справаздач іх каля 100 тысяч, — падкрэсліла Святлана Белаш.

37 % беларусак мае вышэйшую адукацыю і аддае працы ў сяроднім 38 гадзін у тыдзень. Апошні паказчык, дарэчы, адзін з самых высокіх у Еўропе.

Спецыяліст расказала, што сёння дапамогі атрымліваюць каля 500 тысяч дзяцей, а гэта кожнае трэцяе дзіця ў краіне. У Беларусбанку адкрыта 59 тысяч дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал» на агульную суму 589 мільёнаў долараў. Аказваецца і адрасная дапамога: істотнай падтрымкай з'яўляецца бясплатнае харчаванне для дзяцей і бясплатны набор прадуктаў на суму каля 100 рублёў штомесяц. Такімі відамі падтрымкі карыстаецца ў нас каля 18 тысяч дзяцей.

Святлана Белаш праінфармавала і аб нядаўніх новаўвядзеннях:

— Летась у новай рэдакцыі быў прыняты закон аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Узмоцнена падтрымка сем'яў з дзецьмі-інвалідамі і сем'яў, дзе бацькі з'яўляюцца інвалідамі. А таксама маладым жанчынам, якія ўпершыню становяцца матулямі і не маюць працоўнага стажу. Яны атрымліваюць пэўную выплату да дапамогі па цяжарнасці і родах, калі яна налічваецца ў мінімальным памеры. Падчас вырашэння жыллёвых пытанняў шматдзетных і маладых сем'яў Указам Прэзідэнта ўведзены новыя механізмы падтрымкі. Гэта субсідыі на аплату часткі працэнтаў і субсідыі на пагашэнне асноўнага доўгу. Пакуль толькі ў першым чытанні прыняты Працоўны кодэкс, у якім прадугледжана норма аб увядзенні бацькоўскага адпачынку пры нараджэнні дзіцяці.

Святлана Белаш падкрэсліла, што асаблівую увагу ў краіне ўдзяляюць шматдзетным маці. За мацярынства прадугледжана высокая дзяржаўная ўзнагарода — ордэн Маці. У Беларусі яго атрымала 9531 жанчына, прычым толькі сёлета — больш за 600 шматдзетных маці.

Алена КРАВЕЦ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Нашы дзеці

З ІНТЭРНАТА — У СЯМ'Ю

Дзесяць інтэрнацкіх устаноў для сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, закрылі ў сталіцы за 12 гадоў. Мяркуецца, што налета знікне яшчэ адзін мінскі дзетдом. Колькасць дзяцей-сірот з кожным годам таксама змяншаецца. Цяпер у чатырох дзіцячых дамах і дапаможнай школе-інтэрнаце жыве прыкладна 350 непаўналетніх. Бацькоў, якіх пазбавілі правоў у адносінах да сваіх дзяцей, за час выканання патрабаванняў Дэкрэта Прэзідэнта № 18 стала ўтрая менш.

Пры пастаянным павелічэнні дзіцячага насельніцтва колькасць асірацелых малых у Мінску штогод змяншаецца. Раней у сталіцы было 14 сірот у разліку на 10 тысяч непаўналетніх, сёння іх ужо толькі шэсць. Такія лічбы прывяла **Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчык сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама**, расказваючы пра дэінстытуцыялізацыю дзяцей (уладкаванне іх на розныя сямейныя формы выхавання з інтэрнатаў).

— Летась у сем'і грамадзян аддалі 87 гадаванцаў дзетдамоў, пры гэтым 23 дзіцяці ўсынавілі, а 34 малыя ўладкаваны ў апякунскія і прыёмныя сем'і. Бацькі шасцярых дзетак аднавіліся ў правах на малых, 24 дзіцяці вернуты ў рэабілітаваныя сем'і. Практычна знікае такое паняцце, як «дзеці-адказнікі». Калі ў 2000 годзе такіх малых было 147, то летась — 17. Справы яшчэ больш пойдуць угору, калі ў Мінску адкрыюць гарадскі сацыяльна-педагагічны цэнтр, у дадатак да аналагічных раённых устаноў.

Думаецца, што закрыць усе дзетдамы ў сталіцы не атрымаецца. Дзве-тры такія ўстановы маюць права на існаванне, лічыць спецыяліст:

— Кожнаму асірацеламу непаўналетняму форма ўладкавання вызначаецца індывідуальна. Бывае і так, што найлепшае рашэнне — дзіцячы дом, асабліва для падлетка. Пры дзяржаўным утрыманні сёння выхаванцу дастаецца больш увагі, чым у многіх сем'ях, бо не кожны бацька па выхадных заўжды водзіць сваіх дзяцей на розныя мерапрыемствы. Акрамя таго, усе дзеці захвочаны дадатковымі заняткамі па інтарэсах. Умовы жыцця ў дзетдамах максімальна набліжаны да хатніх — у дзяцей асобныя пакоі на двух-трох чалавек. Усіх гадаванцаў матывуюць на вучобу. Пасля дзявятага ці адзінаццатага класа яны ідуць вучыцца далей. Сёлета чацвёра з 56 выпускнікоў дзіцячых дамоў паступілі ў ВНУ, двое — у сяроднія спецыялізаваныя навучальныя ўстановы. Так што сіроцтва не азначае прысуд.

Найбольш паспяхова ў нас развіваецца апякунская форма выхавання дзяцей. 96 малых з дзетдамоў рэгулярна забіраюць да сябе на выхадныя, святы і канікулы таксама і патранатныя выхавацелі, якія заключаюць дагавор з інтэрнатамі.

— Палажэнне аб патранатным выхаванні нам вельмі дапамагае. Знаходзячыся нейкі час у сям'і, выхаванцы дзетдамоў атрымліваюць вопыт нармальных сямейных стасункаў, — дадае Зінаіда Вараб'ёва. — Як і раней, шукаем найлепшае жыццевызначэнне сірот з адхіленнямі псіхафізічнага развіцця. Такіх дзетак уладкаваць у сям'ю даволі цяжка. А яшчэ не кожнае дзіця — перш за ўсё падлеткі — само жадае патрапіць у сям'ю, і мы, вядома, прыслухоўваемся да іх пажаданняў.

Кожная дзіцячая ўстанова чымсці адметная. Напрыклад, у дзіцячым доме ў Першамайскім раёне сталіцы ўсе дзеці штодня праводзяць гадзіну за чытаннем мастацкай літаратуры, прычым без прымусу. Гэта ўжо адна з традыцый. Дарэчы, ужо 30 гадоў з дня адкрыцця гэтую ўстанову ўзначальвае Валянціна Зяневіч. Пра яе жыццёвы шлях і багаты вопыт працы мы абавязкова раскажам у адным з найбліжэйшых нумароў «Сямейнай газеты».

Ірына СІДАРОК

З КІМ ДА ВЯНЦА — З ТЫМ ДА КАНЦА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Але, тады ў мяне пытанне: калі не так важна прысутнасць штампа ў пашпарце, то чаму важна яго адсутнасць? Калі моладзь пачынае сустракацца, то пытанні багаслоўя спачатку цікавяць іх менш за ўсё. Праходзіць час і ўзнікае разуменне, што далёка не ўсе праблемы можна вырашыць, абапіраючыся толькі на сваё каханне. Шлюб — гэта якраз адзін з тых сродкаў, што дапамагаюць у сітуацыях, калі пачуцці пачалі прытупляцца. Узаемныя абавязкі і абяцанні перад Богам стрымліваюць людзей ад маральнага разлажэння ды натхняюць у барацьбе за сваю сям'ю ў пераадольванні дэзынтэграцыйных фактараў.

Разам з тым, хапае ў наш час хлопцаў і дзяўчат, якія па-ранейшаму імкнуцца да стварэння традыцыйнай сям'і.

Акрамя таго, нязменным застаецца колькасць вянчанняў пар, якія пражылі доўгі час у зарэгістраваным шлюбе, выгадавалі дзяцей і дачакаліся ўнукаў. Ім царкоўны шлюб даецца складаней, чым маладым парам. Але ўсё адно добра, што на зыходзе зямнога жыцця яны прыходзяць да пэўнага кансэнсусу наконт веры ў Бога і неабходнасці царкоўнага шлюбу.

«У ГОРЫ І РАДАСЦІ, БАГАЦЦІ І БЕДНАСЦІ»

Першае пытанне ад Сергія Лепіна да пар, якія хочуць вянчацца: «Навошта?» Адказ, як правіла, ён чуе прыблізна аднолькавы: «Каб шчасце, здароўе, багацце былі, дзеткі нарадзіліся». Следам другое пытанне: «А што калі ўсяго гэтага не будзе? Застанецца паміж вамі што-небудзь?» Большасць маладых адказаць не гатовыя.

Святары не стамляюцца паўтараць: вянчанне — не панацэя ад грахоў ці разводу. Так, царкоўны шлюб заахвочвае чалавека быць лепшым, дае сілы і імпэт, каб справіцца са спакусамі. Стварае ўмовы, у якіх будзе прасцей застацца разам, чым разысціся. Але толькі тады, калі чалавек сам прыкладае для гэтага намаганні.

— З хрысціянскага пункту гледжання галоўная мэта сям'і нават не нараджэнне дзяцей і не вырашэнне матэрыяльнага пытання, а менавіта выратаванне душы. Людзі аб'ядноўваюцца, каб разам змагацца з грахамі і слабасцямі. У шлюбе можна не здабыць грошай, а толькі згубіць іх. І могуць не з'явіцца дзеці. Але калі вы ажаніліся, дык, будзьце ласкавыя, штодня працаваць над сабой разам са сваёй паловай. Таінства шлюбу для хрысціян асэнсоўваецца толькі ў адносінах да Хрыста і Царквы. Таму царкоўныя саюзы хрысціяніна з нехрысціянінам немагчымыя ўвогуле, паколькі яны не прадугледжваюць стварэнне сям'і як маленькай царквы, дзе будзе праслаўляцца імя Божае і яго запаветы. Аднак у Беларусі вянчанні паміж праваслаўнымі і каталікамі не рэдкасць. Праўда, з пэўнай умовай ад царквы: дзеці павінны быць хрышчаныя ў праваслаўі.

Нават ідэальны на старце шлюб — рэч кволая. Што тады казаць пра тыя адносіны, якія з самага пачатку азмрочваюць адрозненні рэлігійных поглядаў. Іх значнасць з цягам часу становіцца толькі большай. Асабліва калі да гэтага падключаюцца цешчы, свякрові ды іншыя цёткі-дзядзькі. Напрыклад, у спрэчках дзе вянчацца, дзе хрысціць дзяцей: у царкве альбо касцёле... Гэта толькі здаецца, што шлюб — асабістая справа дваіх. Не, насамрэч гэта пытанне грамадскае, бо ў выніку шлюбу аб'ядноўваюцца цэлыя роды. Аднак мы маем шмат станоўчых прыкладаў змешаных шлюбаў і адмоўных — не змешаных.

КРОПКА НЕЗВАРОТУ

Не так даўно на слыху з'явілася новае слова «развянчанне». Многія па няведанні пачалі ўспрымаць яго як антонім да вянчання і сінонім да разводу. Але не ўсё так проста. У епархію прыходзяць пары, якія ўжо даўно не жывуць разам і нават паспелі завесці іншыя сем'і. У іх узнікае жаданне абвянчацца зноў. Вось яны і ўспамінаюць, што калісьці ўжо давалі абяцанне ў вернасці іншаму чалавеку перад Богам. Аднак далёка не кожны можа атрымаць бласлаўленне на паўторны шлюб. Ёсць у народзе красамоўная прымаўка на гэты конт: «Першая жонка ад Бога, другая — ад людзей, трэцяя — ад чорта».

— Царква можа толькі звесці, «развенчваннямі» яна ніколі не займалася. Вянчанне ўяўляе сабой таінства з адпаведным чынапаследаваннем (спалучэннем малітваў, дзеянняў і песняпенняў), і аніякага чыну «развянчання» не існуе, — тлумачыць Сергій Лепін. — Людзі не могуць развесці тое, што аб'яднаў Гасподзь! Але часам муж і жонка ствараюць сітуацыі, калі разам жыць немагчыма. Напрыклад, калі адзін з сужэнцаў адмовіўся ад Хрыста, здрадзіў сваёй палавінцы, рабіў замах на яе ці дзяцей жыццё і здароўе. Аборт, які жанчына зрабіла без ведама мужа, невылечныя захворванні, што з'явіліся ў выніку распуснага ладу жыцця, — таксама верагодныя прычыны для разыходу. Тут адзінае, што можа зрабіць царква — засведчыць, што шлюб спыніў сваё існаванне. Яго няма! Не таму, што духавенства яго анулявала, а таму што людзі самі яго знішчылі. Царква ў такіх абставінах толькі выдае нешта падобнае на пасведчанне аб смерці — але не людзям, а іх пэўным адносінам.

АД НУДЫ ДА ГРАХОЎ — АДЗІН КРОК

Настаяцель храма іконы Божай Маці «Спатоленне загінулых» горада Лунінца протаіерэй Сергій КРЫШТАЛЬ падзяліўся мясцовай статыстыкай: за паўгода ён абвянчаў усяго дзве пары.

— Нельга адназначна сказаць, добра гэта ці дрэнна. Сілком маладых у царкву не пагоніш, ды і навошта? Калі ты хрысціянін і імкнешся да праведнага жыцця, то, безумоўна, сам прыйдзеш вянчацца. А калі да веры ты ўсё жыццё быў абыякавы, у царкву не ходзіш, то сапраўды няма чаго станавіцца пад вянец. Да таго ж царква не асуджае шлюбы, якія зарэгістраваныя толькі ў загсе. Магчыма, гэта ваш варыянт.

Вянчанне разумее пад сабой стварэнне сям'і як малой царквы. Дзе муж — сімвал Хрыста, жонка — сімвал Царквы. Царква захоўвае вернасць Хрысту, яна вядзе дзяцей да яго. Галава сям'і — гэта, перш за ўсё, маральны аўтарытэт. Ён ведае, як дапамагчы, абараніць і скіраваць у правільны бок. Так павінна быць у ідэале. Зразумела, на практыцы бывае зусім наадварот. Колькі навокал прыкладаў, калі жанчына ўзвальвае на свае плечы мужчынскія абавязкі і цягне лямку за дваіх.

— Кажуць, быццам цяпер іншыя часы насталі. Многія апраўдваюць сваю распуснасць тым, што «зараз усе такія, сам свет дыктуе новыя ўмовы». А я не згаджуся. Непрыручаныя страсці кожнага асобна ўзятага чалавека і жаданне іх прыкрыць — вось сапраўдная прычына распаду сем'яў. Апостал Павел сказаў: «Усё мне дазволена, але не ўсе на карысць». Трэба разумець, што свабода — вялікі дар, але трэба ўмець правільна ёй распарадзіцца.

У протаіерэя нярэдка пытаюцца: «Чаму тады нашы бабулі і дзядулі, якія жаніліся ў савецкі час і не вянчаліся, жылі шчаслівa і для іх пытанне разводу нават не паўставала?» А хто іх выхоўваў? Тыя, чые жыццёвыя каштоўнасці складваліся яшчэ ў дарэвалюцыйны час. Сёння ж мы якраз бачым вынікі сямідзесяцігадовага атэізму. А да XX стагоддзя так мала разводаў было, бо народ працаваў ад ранку да ночы ў прамым сэнсе. Святыя Айцы кажуць: «Калі ў чалавека рукі не занятыя працай, то галава будзе занятая дурнымі думкамі». Цяпер працуем мы менш, грошай маем больш, вось і пачынаем спакушацца ад нуды, — тлумачыць бацюшка. — У хрысціянстве шмат увагі аддаюць паняццю цнатлівасці. Яно азначае не толькі нявіннасць у плане фізічных адносін паміж мужчынам і жанчынай (хоць гэта таксама вельмі важна). Стараслаўянскае слова «целомудрие» літаральна тлумачыцца як цэласны погляд на свет. Калі яго няма, мы ад адных мэт і ідэй пераскокваем на іншыя. У такім выпадку нам не пазбегнуць бессэнсоўных хістанняў і растрачвання жыцця на пустое. Пра якую тады сям'ю можа ісці гаворка?

ЯК НЕ ПАМЫЛІЦЦА?

Адна з частых прычын, з якой сучасная моладзь адмаўляецца ад вянчання, — няўпэўненасць у сваім выбары.

— Нічога страшнага ў сумненнях няма, гэта нармальна. Увогуле, упэўненым можна быць толькі ў Божай волі. У Кнізе прарока Ісаі сказана: «Сын мой, нават калі маці забудзе цябе, я ніколі цябе не забуду». А вось у 115 псалме, які чытаем перад прычасцем, знаходзім: «Усякі чалавек — падман». Гэта не азначае, што нельга нікому давяраць. Можна і безумоўна трэба! Але пры гэтым разумеючы, што людзі не ідэальныя. Калі мы моцна і шчыра кахаем чалавека, то гатовыя пераадолець любыя боязі і сумненні. Жаданне звязаць сваё жыццё з іншым — гэта заўсёды рызыка, — лічыць Сергій Крышталь. — Вялікія праблемы ў сямейным жыцці бываюць тады, калі побач з вамі чалавек, які «дазваляе сябе кахаць», а сам не кахае. Такія адносіны нездаровыя, рана ці позна іх чакае правал. Тут і сам вымучышся, і дзеці будуць бачыць скажоную мадэль адносін. Хочацца пажадаць усім знайсці таго, хто разгледзіць у вас асобу, якую пакахае і з якой адважыцца пайсці пад вянец.

Ганна КУРАК.

АДНОЎЛЕНЫ АБРАД

Абрады, традыцыі, звычаі — адметныя рысы кожнага народа, неад'емны складнік яго духоўнай культуры. Менавіта яны адлюстроўваюць народную душу, надаюць непаўторнасць, умацоўваюць сувязь пакаленняў. А гістарычныя звычаі беларусаў, бясспрэчна, унікальныя.

Нараджэнне дзіцяці — велізарная радасць у жыцці кожнага з бацькоў. Абрад хрышчэння дзяцей — гэта асаблівая падзея, да якой трэба рыхтавацца пэўным чынам.

У Ціманаўскім сельскім доме культуры на Магілёўшчыне памятаюць народныя традыцыі і адраджаюць народныя абрады. Абрад хрышчэння дзіцяці, характэрны для гэтай мясцовасці, адноўлены работнікамі культуры дзякуючы ўспамінам старажылаў. (Рэканструкцыю першага купання і хрышчэння прадэманстравалі для жыхароў аграгарадка сёлета ў канцы жніўня.)

— Пра абрад хрышчэння дзіцяці мы даведаліся са слоў Марыі Цыкуновой, — кажа **загадчыца Ціманаўскага СДК Таццяна ПІКУН.** — Падчас фальклорнай экспедыцыі запісалі ў 75-гадовай Марыі Нічыпараўны не толькі пэўныя факты, але і абрадныя песні.

— Пры першым купанні немаўляці бабка абавязкова кідала ў ваду хлеб, соль, збожжа і сярэбраную манетку, — тлумачыць **мастацкі кіраўнік Людміла БРЭДЗІХІНА,** якая выконвала ролю бабкі. — Гэта сімвалізуе, што дзіця будзе расці здаровым і ў дастатку.

Перад хрышчэннем бабуля выносіць дзіця да кумы і кажа: «Бярыце народжанае, а прынясіце нам хрышчонае». Пасля таго, як усе члены сям'і бласлаўляюць дзіця, кумы адпраўляюцца ў царкву. Бацькі па традыцыі застаюцца дома.

Згодна з павер'ем, у былыя часы, калі хросныя бацькі адпраўляліся ў царкву, гаспадар запрашаў сваякоў і суседзяў на маючую адбыцца ўрачыстасць. На стол у асноўным падавалі мучныя вырабы: бліны, пірог з пшанічнай мукі, розныя перапечкі, піражкі. Некаторыя госці прыносілі аладкі ў хустачцы.

Дачакаўшыся з царквы хросных бацькоў з дзіцем, усе дарослыя садзіліся за святочны стол. Елі абрадавую кашу і адорвалі немаўляці падарункамі.

Фота Надзеі САБІРАВАЙ.

Вакол кашы, дарэчы, разгарнуўся цэлы спектакль. Яе выкуплялі, а затым кожнаму госцю давалі пакаштаваць. З'еўшы лыжку, яны клалі ў яе манету і казалі пажаданні.

— Як жа цікава заўважаць, што многія традыцыі жывыя, па-ранейшаму перадаюцца ад пакалення да пакалення, ад бацькі — сыну, ад маці — дачцэ, — сказала адна з прысутных, **Ганна КІРПІЧЭНКА,** якая прыйшла ў клуб паглядзець на работу аднавяскоўцаў.

Дар'я ЭВЕРС.

КАЛЫХАНКА АД «АЎРЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Юлія Быкава і Яўген Алейнік ужо 13 гадоў як утвараюць сямейны і творчы дуэт. «Гэта калі лічыць афіцыйна, з рэгістрацыі шлюбу ў загсе, — удакладняе Юлія. — Насамрэч мы разам з 1999 года — страшна сказаць, хутка 20 гадоў будзе!».

Пра час і сямейны лад

— Існуе стэрэатып, што дзвюм творчым асобам цяжка ўжывацца ў межах адной сям'і...

— І гэта чыстая праўда, — смяецца Юлія. — Літаральна днямі быў чарговы скандал — не сышліся ў меркаваннях наконт новага кліпа. Мне катэгарычна не падабалася, як я выглядаю, а Жэня быў упэўнены, што без гэтага кадра поўная карцінка не складзецца, хоць трэсні. У нас насамрэч часта «гарыць і іскрыць», але толькі на творчай глебе, у тым, што датычыцца працы. У бытавых пытаннях сварымся надзвычай рэдка, але і тады стараемся не трымаць крыўду ў сабе. На мой погляд, калі людзі не вырашаюць канфлікт адразу, а трымаюць крыўды ўнутры, гэта можа выліцца ў няправільныя наступствы, таму, мне здаецца, што ў сямейным жыцці як нідзе важна ўмець гаварыць і дамаўляцца. У нас так: хто лічыць, што ён не мае рацыі, той і пачынае прымірэнчы працэс. Але з узростам усё часцей пагаджаюся з псіхолагамі, што ініцыятыва тут мусіць зыходзіць ад жанчыны. Хоць у мяне самой перад вачыма не было прыкладу, як трэба сварыцца і мірыцца, і Жэня таксама рос у няпоўнай сям'і, і мы абодва прызвычаіліся адстойваць свае перакананні, але разумеем, што часам трэба ісці на кампраміс — калі ты ўзважваеш усе плюсы і мінусы вашых адносін, і плюсоў значна больш — значыць, можна і ахвяраваць нейкімі ўласнымі «я хачу». Мне здаецца, што большасць трывалых сем'яў якраз на гэтым і стаіць — мае бабуля з дзядулем пражылі разам больш як 50 гадоў, і якая б вайна паміж імі не разгортвалася, у выніку ўсё адно адзін аднаму даравалі...

— Пра пары са стажам ходзіць мноства анекдотаў: хто першы забыўся на важную дату — гадавіну заручынаў ці вяселля, народзіны цешчы і г. д. У вас хто адказвае за сямейны летапіс?

Я.: Мы не надаём празмернага значэння датам. Калі ёсць час і магчымасць, з задавальненнем арганізуем сяброўскую вечарынку проста так, без нагоды. А калі працуем над важным праектам, то якая б ні была значная і памятная дата, «адсоўваем» яе на потым.

— Сцэна — справа, якая патрабуе шмат высілкаў і часу, а вы прынцыпова не даўраеце дом і дзяцей чужым людзям. Як тады ўсё паспяваеце?

Ю.: Насілу паспяваем... Вельмі дапамагае мая мама, якая можа пасядзець з унукамі, а калі трэба мне адной на здымкі або некалькі песень у канцэрце выканаць, то Жэня выручае. Нават старэйшы сын Саша можа крыху заняць малога, але адных іх мы, безумоўна, не пакідаем.

— Гэта азначае, абавязкі па доме на «жаночыя» і «мужчынскія» не падзяляеце?

Ю.: Дзякаваць богу, мы ўжо доўгі час разам, і прыйшлі да простай высновы: у каго ёсць час і магчымасць, той і зробіць неабходнае — прыбярэ, прыгатуе і г. д. Жэню без пытанняў можна пакінуць з малымі, якіх ён і зойме, і спаць пакладзе, і пакорміць. Больш за тое, ён вельмі любіць гатаваць што-небудзь гэткае, няпростае — напрыклад, запякае ў духоўцы, а таксама заўжды гатуе на вялікую кампанію. А я, наадварот, не люблю духоўку, з ёй трэба доўга «марочыцца», аддаю перавагу смачным і здаровым стравам, а яшчэ адказваю за супы. Далучаем да дамашніх спраў і дзяцей — Вову ўсё гэта проста ў радасць, як новая гульня, а Сашу трэба зацікавіць, заахвоціць нейкімі стымуламі і перспектывамі.

Пра Міханавічы і Кітай

Карысным у сямейным жыцці аказаўся і медыцынскі вопыт Юлі — скончыўшы Мінскі медуніверсітэт, яна працавала па размеркаванні тэрапеўтам у амбулаторыі пасёлка Міханавічы, і наогул дзесяць гадоў заставалася ў прафесіі, пакуль канчаткова не змяніла кірунак на творчы. Нагледзелася, канешне, рознага — «часам кім толькі не даводзілася быць, і афтальмолагам, і ЛОР-урачом, і хірургам, і «хуткай дапамогай», калі трэба, і ў пяць замацаваных вёсак дабірацца на УАЗіку, які добра, калі даедзе да месца, не зламаўшыся...» Дагэтуль з болем успамінае пра вясковых старых, якія засталіся не тое што без дапамогі, а без элементарнага догляду дзяцей і сваякоў... Затое, гаворыць, прайшла добрую загартоўку і прыдбала карысны досвед, які дагэтуль дазваляе сям'і не трапляць у хвалі эпідэмій і хадзіць ва ўчастковую паліклініку, хіба толькі па даведкі і прышчэпкі.

— Мабыць, якраз дзякуючы гэтай загартоўцы вы спакойна адпусцілі мужа на кантрактную работу ў Кітай, калі чакалі малодшага сына Вову?

Ю.: Гэта прапанова, вельмі заманлівая ў сэнсе грошай і перспектыў, паступіла, калі я ўжо была цяжарная, і мы доўга абмяркоўвалі: ехаць — не ехаць? Меркаваўся кантракт наогул на дзесяць гадоў, і вырашылі, калі ўсё атрымаецца, то Жэня нас потым туды забярэ. У Кітаі для работы насамрэч былі выдатныя ўмовы — найбуйнейшы прадзюсарскі цэнтр у Пекіне, мноства міжнародных праектаў, высокая запатрабаванасць... А я тут да апошніх тыдняў цяжарнасці вяла актыўны лад жыцця, а напярэдадні родаў дамовілася, каб старэйшы сын начаваў у свекрыві, каб ён раптам не застаўся адзін. І, дарэчы, так і атрымалася, «хуткую» ў радзільню сабе выклікала ўначы. Прызнацца, я не люблю гнеўныя допісы маладых матуль пра тое, якія ў нас жахлівыя ўмовы ў радзільнях і якія «ўсе медыкі гады» — паколькі я пабывала, так бы мовіць, з абодвух бакоў барыкад і разумею, што ўсе людзі розныя, і пацыенты, і ўрачы, і нельга абагульняць уласны досвед. Прынамсі мне пашанцавала, роды прайшлі добра, і раніцай ужо даслала радасную СМСку мужу. Так што ніякага асаблівага гераізму ў тым, што давялося нараджаць адной, не бачу — проста так склаліся абставіны.

...А потым абставіны склаліся так, што ў Беларусі стала хітом напісаная імі песня «Сінявокая», з якой пачаўся цэлы маштабны праект, і пераезд сам сабой адмяніўся — усяго праз тры месяцы Яўген Алейнік вярнуўся на радзіму.

— Сёлета вы прадставілі слухачам частку вялікага праекта, прысвечанага малой радзіме. Што можаце расказаць сваім дзецям пра малую радзіму, з улікам таго, што вы абодва — мінчане?

Ю.: А мне здаецца, не важна, дзе знаходзіцца твая малая радзіма, важна, што ты да яе адчуваеш. Маё дзяцінства — напрыклад — гэта сталічны мікрараён Серабранка, і ўсё адно, трапляючы на знаёмыя вуліцы, адчуваю, як нешта шчыміць унутры. Таму з задавальненнем паказала Сашу, у якія дзіцячы садок і школу я хадзіла, расказала, што тут было раней і як змяніўся раён — тым больш, на мой погляд, ён стаў нашмат прыгажэйшы.

Пра тых, хто будзе лепшы за нас

Я.: Што ад нас перанялі дзеці? Саша цікавіцца музыкай — але яму даспадобы электронныя трэкі, так што «Аўра» наўрад ці ператворыцца ў сямейнае трыа. Тым не менш Саша бярэ ўрокі ў нашага гітарыста, вывучае замежныя мовы — ён захапляецца анлайн-гульнямі, і англійская неабходная.

Што да Вовы, то гэта «артыст вялікіх і малых тэатраў» — як сцвярджаюць сваякі, вылітая Юля ў дзяцінстве. «Як расказвалі мае мама і бабуля, я спявала бесперапынна, не змаўкаючы — такім чынам завучвала песні, якія гучалі па радыё і тэлевізары (асабліва любіла італьянскую эстраду), каб яны былі заўжды са мной. Цяпер разумею, як было складана беднай маёй маме, калі мы, сям'я вайскоўца, пераехалі ў Хабараўск, а гэта іншы часавы пояс, і мае спевы прыпадалі якраз на ноч. Уласна, каб хоць крыху ўтаймаваць гэту энергію, мяне і аддалі ў вакальны гурток. Воўка песні, праўда, не спявае, але гэтаксама барабаніць нагамі ў дыван і разыгрывае такія акцёрскія сцэнкі, што трэба бачыць. А яшчэ ён адчайны адарвірог, зноў жа, як я ў дзяцінстве і юнацтве».

— Заўжды хацелася спытаць: што спявачкі выконваюць сваім дзецям у якасці калыханкі?

— Як акын, спяваю пра тое, што бачу — прыгадаю знаёмы матыў, і давай на яго «ля-ля», — усміхаецца Юлія. — Аднак на публіку гэта выносіць нельга, бо словы не акадэмічныя — «спі, мая радасць», а з гэткімі прыкольчыкамі, выключна для ўнутрысямейнага ўжытку.

Калыханка ў рэпертуары «Аўры» ўсё ж ёсць — яшчэ для старэйшага сына Яўген запісаў прыгожую інструментальную кампазіцыю, якую перыядычна выконвае на канцэртах.

— Сёння многія бацькі схільныя шмат патрабаваць ад школы, садка. Педагогі ў адказ нагадваюць, што выхаванне і адказнасць за дзяцей пачынаецца ў сям'і. На ваш погляд, што перадусім трэба закласці ў сваіх дзяцей, якія веды ім даць?

Ю.: Я таксама лічу, што сям'я — аснова асноў. І яшчэ з унутрычэраўнага перыяду яна можа навучыць галоўнаму: адносінам да свету ў цэлым, да людзей — блізкіх і наогул. Навучыць, што такое любоў, міласэрнасць, словам, даць тую базу, з якой дзіця пойдзе далей па жыцці. Безумоўна, кожны мусіць сам набіць свае гузакі, колькі разоў ты ім не растлумачыш свой досвед, аднак мусіць быць уяўленне аб тым, што такое добра і што такое дрэнна. Нельга ігнараваць патрэбы свайго дзіцяці — гэта такая памылка, якая ў далейшым можа дорага абысціся, а са свайго боку, варта паспрабаваць навучыць усяму таму, што ведаеш і ўмееш ты сам. Словам, нічога новага я тут не адкрыю.

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота з асабістага архіва герояў.



Зазвычай лета ў артыстаў — гарачая пара, але і тут сям'я выпрацавала сваю стратэгію: як правіла, у жніўні ўсе вялікія фестывалі ўжо завяршаюцца, і выпадае досыць вольнага часу, каб разам з дзецьмі зладзіць сабе канікулы. Напрыклад, сёлета ў поўным складзе з'ездзілі ў адзін з санаторыяў пад Мінскам. «І хоць словазлучэнне «адпачынак з дзецьмі» для нас гучыць як аксюмаран, тут усё атрымалася найлепшым чынам: мы і змянілі абстаноўку, і паралельна вырашалі нейкія рабочыя пытанні».

У Жэні і Юлі ёсць яшчэ адзін верны памочнік — кошка Дуся, якая, па сутнасці, няньчыла і выхоўвала абодвух дзяцей: зусім маленькім дазваляла нават цягаць сябе за хвост, а з узростам усё больш усталёўвала рамкі дазволенага. Таксама Дуся, як сцвярджаюць гаспадары, заўжды ведае, хто пацярпелы бок, а хто завадатар канфлікту — падыходзіць да вінавата га і пачынае сярдзіта мяўкаць.

ШУКАЮ МУЖА З ЗАМЕЖЖА

Некалькі гадоў таму ў Мінску адбыўся проста казачны сюжэт: 35-гадовы арабскі прынц прыехаў у нашу краіну на спартыўныя спаборніцтвы. І з першага погляду закахаўся ў 19-гадовую студэнтку Наташу, якая падчас вакацый працавала афіцыянткай у гасцініцы. Літаральна праз дзень прынц зразумеў, што хоча бачыць дзяўчыну сваёй жонкай, праз тыдзень зрабіў прапанову і атрымаў згоду яе бацькоў. І павёз у далёкі Дубай, дзе Наташа стала шэйхай Айшай аль-Саід. Прынц пасяліў маладую жонку ў прыгожым белым палацы з мармуру, асыпаў золатам і каштоўнасцямі, падарыў нават ручнога гепарда. Неўзабаве ў Айшы нарадзілася дачка, якую прынц вельмі песціць...

Напэўна, пра такі паварот уласнага жыцця марылі і мараць многія жанчыны, якія шукаюць сямейнае шчасце з замежнікам. Штогод каля 400 беларусак рэгіструюць шлюб з іншаземцамі. Штосьці яны знаходзяць, але штосьці і страчваюць у такіх стасунках.

Выйсці замуж за мяжу — мара 1990-х, якая нарэшце стала рэальнасцю. Напрыканцы мінулага стагоддзя здарыўся феномен, які ў спецыялістаў атрымаў назву «жаночая шлюбная міграцыя». У тыя гады была зламана праслаўтая жалезная заслона. Подых вольнага жыцця закружыў галаву, жыхары СНД адкрывалі далёкі свет, і, як ні дзіўна, мы таксама аказаліся цікавыя для замежнікаў. На Захадзе расквітнела мода на «славянскіх» нявест. Сотні нашых суайчыннік сталі з асаблівай увагай чытаць шлюбныя аб'явы, а самыя смелыя нават пасылалі свае фота і запаўнялі карткі шлюбных агенцтваў. Ды і сёння многія працягваюць шукаць сваё каханне і сямейнае шчасце ў замежжы. Навошта нашай жанчыне муж-іншаземец? Сацыёлагі мяркуюць, што такі выбар вымушаны. Спецыялісты склалі спіс прыярытэтаў — якасцяў, якія жанчыны звычайна шукаюць у спадарожніку жыцця. У выбранніка павінна быць жыллё або перспектыва ім абзавесціся ў найбліжэйшай будучыні. Плюс пастаянная работа і стабільны даход. Ён павінен любіць дзяцей. Калі браць чарку, то толькі па святах... Пагадзіцеся, патрабаванні не занадта завышаныя! Аднак адпавядае гэтым патрабаванням толькі адзін з дзесяці айчынных мужчын. А сярод замежных патэнцыйных жаніхоў — кожны восьмы. Вось такая арыфметыка...

Акрамя таго, замежныя мужчыны лаяльна ставяцца да перспектывы ажаніцца з жанчынай з дзіцем (і нават з двума). Нашых жа мужчын, што і без сацыёлагаў зразумела, перспектыва «карміць чужое дзіця» рэдка натхняе.

Вось і атрымліваецца, што падыходзячага на ролю прыстойнага і адказнага за сям'ю мужа прасцей знайсці за мяжой, чым у суседнім дварэ. Таму і рынуліся на пошукі «сіняй птушкі» шчасця беларускія прыгажуні за мяжу, калі з'явілася ў іх такая магчымасць.

Геаграфія шлюбаў беларусак багатая: Германія, Польшча, Чэхія, Аўстрыя, Швецыя, Іспанія, Бельгія, Францыя, Ізраіль, арабскія краіны. І многія жывуць з мужамі-іншаземцамі ў каханні і згодзе, шчаслівa дзяцей гадуюць. Такія ёсць і сярод маіх знаёмых. Іх мужы аказаліся сапраўды «другой палавінкай», апорай і надзеяй. Што ж, і надалей ім паразумення і дабрабыту!

Аднак зусім не лішнім будзе напомніць, што шлюб з замежнікам, на жаль, можа стаць не толькі шчаслівым білетам у дом з квітнеючым садам і гарантаваць бязбеднае жыццё. Гэта можа быць таксама і зламаны лёс.

Большасць маладых дяўчат вераць у казачны паварот свайго шляху, звяртаючыся ў шлюбныя агенцтвы, службы знаёмстваў, пішучы на шматлікія інтэрнэт-сайты. Толькі вось не заўсёды мары спраўджваюцца.

...Алена праз інтэрнэт-сайт пазнаёмілася з самавітым, паважаным галандцам. Той прапанаваў ёй для пачатку «пробны шлюб», запэўніўшы, што ён прызнаецца гэтак жа, як і афармлены ў мэрыі. Алена прыехала ў Галандыю са сваёй дачкой. Новы муж пасяліў жанчыну ў недабудаваным доме, прапанаваўшы заняцца яго добраўпарадкаваннем — для душы, зразумела, каб не сумаваць. Шчаслівая «маладая» кінулася парадак наводзіць. А ў мужа любімым заняткам сталі бясконцыя падлікі на калькулятары выдаткаў на Алену і яе дачку. Гэтыя выдаткі ні ў якім разе не павінны былі перавысіць адведзенай для гэтага сумы. Ну, а калі Алена завяршыла добраўпарадкаванне ў доме, муж заявіў, што добра было б ёй вярнуцца ў родны Магілёў. Маўляў, там жыць танней, ды і шлюб у іх «пробны», і наогул, калі Алена жадае, то можа нават паспрабаваць жыць з іншым мужчынам...

У мужоў-замежнікаў нават пры афармленнні афіцыйнага шлюбу бываюць «свавольствы» на мяжы прадуманага падману. Напрыклад, аказаць жонцы вялікі давер: зарэгістраваць на яе імя фірму і ўзяць пад гэты праект крэдыт у банку. Грошы «раптам» вярнуць не атрымліваецца, а ў судзе адказнасць па ўсіх пунктах нясе «ўладальніца фірмы».

Калі замежны жаніх невымоўна рады, што ў вас двоетрое дзяцей, і спяшаецца зарэгістраваць афіцыйна шлюб, таксама не варта спяшацца. Хутчэй за ўсё гэты спадар — беспрацоўны. Шлюб дасць яму магчымасць атрымліваць істотную дапамогу на жонку і яе дзяцей. Толькі наўрад ці вы ўбачыце гэтыя грошы...

Хапае ў шлюбнай латарэі з замежнікамі і крымінальных сюжэтаў. Мінчанка Ларыса выйшла замуж у Швецыю. Нарадзіла сына. Але сямейнае жыццё не складвалася. Сваркі і скандалы часам заканчваліся рукапрыкладствам. Ларыса ў адчаі сфатаграфавала сінякі, атрыманыя пасля збіцця мужам, і звярнулася ў паліцыю. Аднак паводле сустрэчнага іску яе абвінавацілі ў спробе «забіць грамадзяніна Швецыі» і абавязалі выплаціць — былому ўжо мужу — салідную грашову кампенсацыю. Зрэшты, сітуацыя тыповая, калі з-за няведання законаў чужой краіны жонкі-іншаземкі не могуць адстаяць свае правы. Іх заявы часта нават да суда не даходзяць.

Тым не менш спецыялісты па сямейных адносінах лічаць, што тэндэнцыя выходзіць замуж за замежнікаў будзе і далей захоўвацца. Чаму? Хоць бы таму, што «родных» беларускіх мужчын на ўсіх нас проста не хапае. У Беларусі толькі ў самай маладой узроставай групе, згодна з данымі статыстыкі, суадносіны жанчын і мужчын прыкладна роўныя. А чым бліжэй да 30 гадоў, тым больш гэты паказчык змяняецца ў бок «прыгожага» полу. У заходніх краінах — наадварот. Напрыклад, у той жа Галандыі на 230 мужчын шлюбнага ўзросту прыпадае ўсяго 159 жанчын. Вось і шукаюць галандскія, а таксама шведскія, аўстрыйскія, нямецкія, а цяпер ужо і кітайскія жаніхі сабе нявестаў за мяжой.

Асабліва схільныя да замежнага замужжа беларускі, якія перажылі развод з прычыны бытавога бескультур'я мужоў, іх прыхільнасці да алкаголю. Перад такімі жанчынамі паўстае дылема: або застацца век векаваць адзінокай на радзіме, або думаць пра ўласнае сямейнае «гняздо» з замежнікам. Такім чынам, у апошнія гады, згодна з вывадамі спецыялістаў, у памкненні з'ехаць «замуж за мяжу» пераважаюць менавіта маральна-псіхалагічныя матывы: сталая жанчына шукае ў спадарожніку жыцця павагі да сабе, жадае бачыць пэўны культурна-бытавы ўзровень.

Але плануючы замежнае замужжа, жанчыне неабходна таксама працаваць над сабой. Ёй варта добра ведаць не толькі замежную мову, але і ўяўляць менталітэт, культуру і законы чужой краіны. Трэба помніць таксама пра сваю нацыянальную годнасць і ні ў якім разе не спяшацца адмаўляцца ад беларускага грамадзянства. У такім выпадку правы жанчыны і яе дзяцей будуць гарантаваны законамі нашай краіны, а юрыдычная і іншая дапамога будзе забяспечаная праз беларускае Міністэрства замежных спраў. Сёння ўсім добра вядомы выпадак са спробай адабраць сына-немаўля ў нашай знакамітай тэнісісткі Вікторыі Азаранкі яе бойфрэндам. Толькі дзякуючы ўдзелу беларускіх юрыстаў пытанне вырашылася на карысць маці, грамадзянкі Беларусі.

Людміла КУСЛІВАЯ.

Пра тое, як яшчэ можна падстрахавацца, плануючы замежнае замужжа, і як падрыхтавацца да жыцця ў чужой краіне, можна даведацца са старонак кастрычніцкага нумара часопіса «Алеся».

АЛЕСЯ Чытайце ў кастрычніцкім нумары

«Зорка» па-за сцэнай

Заслужаная артыстка Беларусі Іна Афанасьева неўзабаве адзначыць двайны юбілей — напрыканцы кастрычніка ёй споўніцца 50 гадоў, а 2 лістапада ў Палацы Рэспублікі спявачка дасць вялікі сольны канцэрт «Каханне маё...», прысвечаны 30-годдзю творчай дзейнасці. Кастрычніцкі нумар часопіса «Алеся» раскажа не толькі пра творчыя планы юбіляркі, але і пра сямейнае кола «зоркі», якое яе заўсёды натхняе і падтрымлівае. Чытачы даведаюцца таксама пра захапленні і схільнасці любімай спявачкі...

Хобі можа стаць бізнесам

У славянскай культуры здаўна прынята ашчадна ставіцца да тканіны. Магчыма адсюль і ўзнікла ў народзе традыцыя шыцця са шматкоў. А любоў да яго ператварыла спосаб эканомна выдаткоўваць тканіну ў самастойны від народнага мастацтва. У сучасных майстрых гэта тэхніка называецца на англійскі лад — «пэчварк». Мінчанка Анастасія Лях, пра якую ў кастрычніцкім нумары расказаў жаночы часопіс «Алеся», убачыла ў грамадскім транспарце стракатую дзіцячую коўдрачку. І ёй захацелася ўпрыгожыць утульнымі рэчамі са шматкоў свой дом. Неўзабаве хобі ператварылася ва ўласны паспяховы бізнес.

Матушка з Каменнай Горкі

Яны пазнаёміліся яшчэ дзецьмі. Сябравалі, сталелі, вучыліся. Надышоў час, калі малады святар Павел Сярдзюк зрабіў прапанову рукі і сэрца сваёй даўняй сяброўцы — культуролагу Вераніцы. Неўзабаве была выдзелена зямля ў мінскім мікрараёне Каменная Горка для будаўніцтва храма святіцеля Мікалая Японскага. З часам, дзякуючы намаганням настаяцеля протаіерэя Паўла, храм стаў цэнтрам прыцягнення не толькі для прыхаджан, але і для многіх тутэйшых жыхароў. Ва ўсіх пачынаннях Паўла актыўна падтрымлівала жонка. Шматдзетная маці Вераніка Сярдзюк у кастрычніку стала госцяй часопіса «Алеся».

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Узденского райпо (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

лот 1: здание магазина общей площадью 113,0 кв. м, инв. № 623/С-58710, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625680213201000206 площадью 0,0963 га по адресу: Минская область, Узденский район, Дещенский с/с, д. Теплень, ул. Октябрьская, 45.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 17 515,80 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 751,00 бел. руб.**);

лот 2: здание магазина общей площадью 82,7 кв. м, инв. № 623/С-58709, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625680213501000066 площадью 0,0636 га по адресу: Минская область, Узденский район, Дещенский с/с, д. Тристенец, ул. Тристенецкая, 30.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 11 253,31 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 125,00 бел. руб.**);

лот 3: здание магазина общей площадью 104,0 кв. м, инв. № 623/С-58711, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683207701000065 площадью 0,0834 га по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Румок, ул. Победы, 1.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 15 942,19 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 594,00 бел. руб.**);

лот 4: здание склада с навесом по железобетонным столбам общей площадью 512,4 кв. м, инв. № 620/С-38757, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622282800003000019 площадью 0,0848 га по адресу: Минская область, Дзержинский район, Негорельский с/с, район аг. Негорелое.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 56 520,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **5 652,00 бел. руб.**).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лотам №№ 1, 2, 3 – 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам № 4 – 5 (пяти) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **26.11.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.11.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

«Организатор торгов, антикризисный управляющий ООО «БЕЛТОРГКОМПАНИ» – ООО «Гран-Консалт», действуя на основании Определения Экономического суда города Минска от 09.04.2018 г. по делу № 194-13Б/2018, сообщает о проведении торгов по продаже имущества. Продавец – ООО «БЕЛТОРГКОМПАНИ»

Торги проводятся в форме открытого аукциона.

№	Наименование объектов торгов	Стоимость единицы (без учета НДС) бел. руб.
1	Кромкооблицовочный станок SCM OLIMPICK 230T	10 749,68
2	Станок Сверильно-присадочный MZ7121W	2 986,65
3	Станок форматно-раскроечный MJ1132B	6 138,76

До подачи заявления на участие в торгах Претенденту необходимо перечислить задаток в размере 10 % от общей стоимости лота на расчетный счет не позднее 06.12.2018 г.: ООО «БЕЛТОРГКОМПАНИ», р/с: № B BY90MTBK30120001093300061404 ЗАО «МТбанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 190890870. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления и по 26 ноября 2018 года, в рабочие дни, с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 68, к. 801.

Торги состоятся 27 ноября 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 68, к. 801.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в объявлении о проведении торгов срок, заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

– заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в объявлении о проведении торгов;

– для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

– для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

– для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

– для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Победитель торгов возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней со дня проведения торгов. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются в день проведения торгов. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Порядок проведения торгов, условия, оформление участия в торгах определяется положением о проведении торгов по продаже имущества ООО «БЕЛТОРГКОМПАНИ», ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах. С дополнительной информацией о предмете торгов можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 68, к. 801.Тел. (017) 399-89-29

Утерянные печать и свидетельство о государственной регистрации СП «БЕЛКАН» (УНП 100364331) **считать недействительными.**

Открытое акционерное общество «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» доводит до сведения акционеров и иных заинтересованных лиц о том, что внеочередным общим собранием акционером ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ», состоявшимся 23.10.2018, приняты решения:

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» за счет средств акционеров путем выпуска дополнительных акций.

2. Об объявлении закрытой подписки на акции ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ».

3. Об утверждении Условий проведения закрытой подписки на акции ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ».

Условия проведения закрытой подписки на акции ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» дополнительного выпуска.

1. Планируемый объем дополнительного выпуска – 199 999 белорусских рублей 50 копеек.

2. Количество и категория акций дополнительного выпуска – 1 333 330 простых (обыкновенных) акций.

3. Номинальная стоимость 15 копеек.

4. Простые (обыкновенные) акции, выпускаемые в результате закрытой подписки, удостоверяют тот же объем прав их владельцев, что и простые (обыкновенные) акции, выпущенные ранее. Решением общего собрания акционеров может быть предоставлено акционерам Общества, владеющим простыми (обыкновенными) акциями, преимущественное право на приобретение дополнительно выпущенных Обществом акций и утвержден порядок реализации такого права.

5. Привилегированные акции при проведении данной подписки не размещаются.

6. Планируемый уставный фонд после проведения подписки – 217 706 рублей 85 копеек.

7. Цена подписки на одну простую (обыкновенную) акцию –15 копеек.

8. Порядок расчета и выплаты дивидендов по акциям, в том числе и по вновь выпускаемым акциям дополнительного выпуска, определен уставом Общества. Общее собрание акционеров вправе при определении направлений распределения прибыли на период до следующего годового собрания принять решение о направлении ее части (в процентах) на выплату промежуточных дивидендов по итогам полугодия, квартала, месяца. В этом случае по окончании каждого соответствующего периода при наличии прибыли, достаточной для выплаты дивидендов, внеочередным собранием принимается решение об определении размера промежуточных дивидендов в белорусских рублях на одну акцию и срока их выплаты. Общее собрание акционеров устанавливает период, за который выплачиваются дивиденды, а также срок выплаты дивидендов. В случае если решением общего собрания акционеров Общества срок выплаты дивидендов не определен, он не должен превышать 60 дней со дня принятия решения об объявлении и выплате дивидендов. Размер дивиденда объявляется в белорусских рублях на одну акцию. Дивиденды выплачиваются в денежных единицах Республики Беларусь, а по решению общего собрания акционеров и с согласия их получателей – в установленном порядке товаром, ценными бумагами (в том числе акциями Общества, находящимися в его распоряжении, или акциями дополнительного выпуска) или иным имуществом. Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составляется на основании данных того же реестра акционеров, на основании которого был составлен список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, принявшем решение о выплате дивидендов. Информация о времени и месте выплаты дивидендов доводится до сведения акционеров в том же порядке, в котором они извещаются о проведении общего собрания акционеров. По заявлению акционера причитающиеся ему дивиденды высылаются почтовым переводом или перечисляются на его счет в банке. Расходы по пересылке (перечислению) дивидендов в пределах Республики Беларусь производятся за счет средств Общества.

9. Размещение дополнительных акций будет осуществляться в виде записей на счетах. Зачисление акций на счета «депо» подписчиков производится не позднее 5 (пяти) рабочих дней с момента зачисления дополнительного выпуска акций на счет «депо» эмитента.

10. Отчуждение акций, приобретенных в результате подписки, их владельцами возможно после осуществления государственной регистрации дополнительного выпуска акций и зачисления этих акций на счета «депо» их владельцев в соответствии с действующим законодательством.

11. Подписка проводится в период с 05.11.2018 г. по 12.12.2018 г. включительно с 9.00 до 15.00 (кроме выходных и праздничных дней) по месту нахождения Общества: 220007, г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35; тел. (017) 223 95 23.

12. Порядок проведения закрытой подписки:

12.1.1. Закрытая подписка проводится в четыре этапа: первый этап – с 05.11.2018 г. по 09.11.2018 г., второй этап – с 12.11.2018 г. по 16.11.2018 г., третий этап – с 19.11.2018 г. по 23.11.2018 г., четвертый этап – с 03.12.2018 г. по 07.12.2018 г. Количество этапов подписки может быть менее указанного выше, в случае если по результатам предшествующих этапов акционеры подписались и оплатили весь объем дополнительной эмиссии.

12.1.2. На первом этапе каждый акционер имеет право подписаться на количество акций дополнительного выпуска, пропорционально его доле в уставном фонде Общества.

12.1.3. Во втором этапе (в случае если в период осуществления первого этапа подписки не были заключены договоры на всю сумму дополнительного выпуска) имеют право участвовать только те акционеры, которые заключили договоры подписки на первом этапе. При этом, каждый из упомянутых акционеров имеет право заключить договоры подписки на следующее количество акций:

$П_2 = (Сэ – П1)*А1/П1$, где

$П_2$ – максимальное количество акций, на которое может подписаться акционер в ходе второго этапа;

$С_э$ – количество акций дополнительной эмиссии;

$П_1$ – общее количество акций, на которое подписались акционеры в ходе первого этапа;

$А_1$ – количество акций, на которое подписался конкретный акционер в ходе первого этапа.

12.1.4. В третьем этапе (в случае если в период осуществления первого и второго этапов подписки не были заключены подписки на всю сумму дополнительного выпуска) могут участвовать только те акционеры, которые заключили договоры подписки на втором этапе. При этом, каждый из упомянутых акционеров имеет право заключить договоры подписки на любое количество акций, оставшихся нераспределенными между подписантами в течение первого и второго этапа.

12.1.5. Акционеры, заключившие договоры подписки на первом-третьем этапе вносят причитающуюся денежную сумму на расчетный счет Общества в срок не позднее 3 (трех) рабочих дней, считая от даты окончания третьего этапа.

12.1.6. Четвертый этап: в случае если акционеры, заключившие договоры подписки на акции дополнительного выпуска, не внесут денежные средства в срок, указанный в п. 12.1.5 настоящих параметров, то акционеры, подписавшиеся на акции на первых трех этапах и своевременно внесшие причитающиеся денежные средства, вправе подписаться на неоплаченное количество акций.

12.1.7. Акционеры, заключившие договоры подписки на четвертом этапе вносят причитающуюся денежную сумму на расчетный счет Общества в срок не позднее 3 (трех) рабочих дней, считая от даты окончания четвертого этапа.

12.2. В случае если по результатам подписки на третьем этапе договоры подписки заключены на количество акций, превышающее планируемый объем эмиссии, то преимущественное право на приобретение акций имеет акционер, ранее других заключивший договор подписки.

12.3. При осуществлении подписки акционеры Общества имеют равные права. В качестве оплаты за акции дополнительного выпуска акционеры имеют право вносить денежные средства. Акционеру может быть отказано в заключении договора подписки, если на дату обращения акционера для заключения договора подписки Обществом по заключенным ранее договорам уже набрана сумма объявленной эмиссии.

12.4. Акционеры-юридические лица (их представители) для заключения договоров подписки представляют документ, подтверждающий полномочия на заключение сделок, а также в случаях, установленных действующим законодательством, решение уполномоченного органа о совершении крупной сделки.

12.5. В случае досрочного внесения акционерами по договорам подписки суммы объявленной эмиссии, подписка может быть прекращена досрочно.

13. Подписка может быть признана несостоявшейся в случае:

13.1. Если в сроки, указанные в п. 12.1.1, не будут заключены договоры подписки на сумму дополнительной эмиссии.

13.2. Запрета выпуска акций Департаментом по ценным бумагам.

14. В случае признания подписки несостоявшейся либо запрета выпуска акций Департаментом по ценным бумагам, Общество обязано в течение 7 (семи) календарных дней от даты принятия такого решения возвратить полученные денежные средства акционерам, принявшим участие в подписке.

УНП 100036332

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

